Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

78 (7364) | Нядзеля, 25 лютага 1945 г. | Цана 20 кап.

„Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама,—яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы. Асуджаны вораг кідае ў бой апошнія сілы, адчайна супраціўляецца, каб пазбегнуць суровай адплаты. Ён хапаецца і будзе хапацца за самыя крайнія і подлыя сродкі барацьбы. Таму трэба памятаць, што чым бліжэй наша перамога, тым вышэй павінна быць наша пільнасць, тым мацней павінны быць нашы ўдары па ворагу“.

(З загада тав. Сталіна да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі).

ЗА ХУТЧЭЙШАЕ АДНАЎЛЕННЕ І УЗДЫМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Айчынная вайна, якая прадаўжаецца амаль чатыры годы, падвергла вялікаму выпрабаванню наш народ і нашу армію, наш совецкі лад, нашу соцыялістычную эканоміку. Гэтае выпрабаванне мы з чэсцю вытрымалі. На чацвертым годзе вайны Чырвоная Армія абрушыла на ворага небывалы па сіле ўдар на фронце велізарнага працяжэння і на тэрыторыі Германіі давяршае разгром нямецка-фашысцкай арміі.

Наша слаўная армія — армія палкіх патрыётаў, армія, якая валодае высокім сталінскім баявым майстэрствам, перамагае таму, што яе падтрымлівае моцны совецкі тыл, усе народы нашай краіны.

Нашы фабрыкі і заводы вырабляюць самалётаў, танкаў, гармат, мінамётаў, бесперапынна у некалькі разоў больш, чым да вайны. У гэтым вялікая заслуга рабочых, інжынераў, тэхнікаў, якія самаадданна працуюць у імя нашай перамогі.

«Чырвоная Армія на чацвертым годзе вайны, дзякуючы клопатам калгаснага сялянства, не адчувае недахопу ў прадавольстве. Калгаснікі і калгаспіцы забяспечваюць рабочых і інтэлігенцыю прадавольствам, а прамысловасць сыравінай, забяспечваюць нармальную работу заводаў і фабрык, якія вырабляюць узбраенне і снаражэнне для фронта. Наша калгаснае сялянства актыўна і з поўным усведамленнем свайго абавязку перад Радзімай салдэйнічае Чырвонай Арміі ў дасягненні перамогі над ворагам» (Сталін).

У цяжкіх умовах вайны калгасы, соўгасы, МТС забяспечылі ў 1944 годзе правядзенне веснавой сяўбы ў сціслыя тэрміны, пры лепшай якасці палявых работ, больш арганізавана правялі ўборку. У выніку павялічыўся валавы збор, а дзяржава атрымала больш збожжа, бульбы, гародніны, бавоўны, ільновалакна і іншых сельскагаспадарчых культур.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) у дакуменце, які друкуецца ў сённешнім нумары нашай газеты асабліва адзначаюць патрыятычны ўздым калгаснікаў і іх дапамогу Чырвонай Арміі ў справе канчатковага разгрому нямецкіх захопнікаў, які выразіўся ў тым, што калгасы многіх абласцей і рэспублік, па пачыну калгаснікаў вызваленай ад нямецкіх захопнікаў Украіны, унеслі ў 1944 годзе ў фонд Галоўнага Камандавання Чырвонай Арміі вялікую колькасць хлеба, бульбы і іншых прадуктаў звыш устаноўленых планаў нарыхтовак. Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі БССР унеслі ў гэты фонд звыш трох мільёнаў пудоў хлеба.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) адзначаюць, што мясцовыя партыйныя, совецкія арганізацыі, калгаснікі, работнікі МТС і соўгасаў нашай рэспублікі побач з другімі вызваленымі ад нямецкіх захопнікаў рэспублікамі і абласцямі дабіліся значных поспехаў ва ўздыме і аднаўленні сельскай гаспадаркі. Гэта — высокая пахвала. Першыя поспехі не павінны, аднак, нікому з нас ускружыць галаву. Мы дабіліся першых поспехаў, мы абавязаны дабіцца значна большага.

«Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) лічаць галоўнай задачай калгасаў, МТС, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у 1945 годзе ўсямернае павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў».

СНК СССР і ЦК ВКП(б) зацвердзілі план сельскагаспадарчых работ па Саюзу, які прадугледжвае павелічэнне пасеўных плошчаў на 8,1 мільёна гектараў у параўнанні з 1944 годам. Асобна СНК СССР і ЦК ВКП(б) зацвердзілі план сельскагаспадарчых работ у сялянскіх гаспадарках Латвійскай, Літоўскай, Эстонскай ССР і заходніх раёнах Украінскай, Беларускай і Малдаўскай ССР.

З гэтых планаў вынікаюць вялікія задачы, шырокая праграма работ усіх партыйных, совецкіх арганізацый, калгаснікаў, рабочых і служачых МТС, соўгасаў, працоўных аднаасобнікаў у Беларускай ССР.

Немцы зруйнавалі нашу гаспадарку, спустошылі нашы палі. Мы павінны напоўніць глебу новымі жывіцельнымі сокамі, у тэрмін засеяць добраякасным насеннем, арганізаваць добры догляд пасеваў, каб дабіцца ў самы кароткі тэрмін павышэння ўраджайнасці да даваеннага ўзроўню.

За тры годы нямецкай акупацыі значна скарацілася пасеўная плошча ў нашай рэспубліцы. Мы павінны прыкласці ўсе намаганні, каб на працягу аднаго-двух год давесці пасеўную плошчу ў БССР да даваеннага ўзроўню.

У нашай рэспубліцы праведзена значная работа па адпаўленню трактарнага парка МТС. У студзені 1945 года паспяхова выканан план рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын.

Соўнарком СССР высока ацаніў дасягнутыя поспехі, прызнаў нашу рэспубліку пераможцай у соцыялістычным спаборніцтве за выкананне плана рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын і пастанавіў уручыць Пераходны Чырвоны сцяг Дзяржаўнага Камітэта Абароны і грашовую прэмію Беларускай ССР. Задача заключаецца цяпер у тым, каб у далейшым заваёваны сцяг трымаць высока і моцна. Ніякага аслаблення ў рабоце па рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын! Наадварот, партыйныя і совецкія арганізацыі павінны цяпер — напярэдадні вясны—праяўляць яшчэ большыя клопаты аб тым, каб хутчэй і лепш адрамантаваць усе трактары, усе машыны.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) падкрэсліваюць, што для паспяховага выканання пастаўленых задач патрэбна ўсямернае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне МТС, калгасаў, соўгасаў. Гэтае ўказанне мае асаблівае вялікае значэнне для нашай рэспублікі. У нас яшчэ нямала такіх калгасаў, у якіх няма належнага парадку і якія патрабуюць асаблівай штодзённай увагі і дапамогі з боку партыйных, совецкіх арганізацый.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) у публікуемым дакуменце не толькі ставяць задачы, але і ўказваюць шляхі ажыццяўлення гэтых вялікіх задач. Абавязак абкомаў, райкомаў КП(б)Б, выканкомаў абласных, раённых, сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных забяспечыць шырокае і паўсямеснае абмеркаванне гэтага важнейшага дакумента. Трэба, каб у выніку абмеркавання ўказанняў СНК СССР і ЦК ВКП(б) былі выпрацаваны практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню пастаўленых задач у кожным сельсавеце, калгасе, МТС, соўгасе, вёсцы.

Да пачатку веснавых палявых работ, якія ў многім рашаюць поспех усяго сельскагаспадарчага года, асталося не так многа часу. Трэба прыняць усе захады да таго, каб усюды было засыпана і ачышчана пасенне, падрыхтавана цягло, адрамантаван інвентар, вывезен гной, каб у кожным калгасе быў вытворчы план, каб калгасныя брыгады, звенні былі ўсюды арганізаваны і ведалі свае задачы.

Для перамогі над ворагам патрэбна не толькі добрае ўзбраенне, але і прадавольства. Хлеб — гэта таксама грозная зброя! Пад гэтым лозунгам павінна праходзіць падрыхтоўка да сяўбы і ўсіх сельскагаспадарчых работ бягучага года.

Загад таварыша Сталіна— баявая праграма нашай дзейнасці

ДАБ'ЕМ ГІТЛЕРАЎЦАЎ

Дванаццаць гадзін.

На камандзе «смірна» замірае чоткі строй байцоў і камандзіраў падраздзялення лейтэнанта Якушына. Падцягнутая і пасвяточнаму ўрачыстая, лейтэнант Старадубава зачытвае загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна, прысвечаны 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

Адзін за другім бярэць слова байцы і афіцэры. Іх выступленні прасякнуты разуменнем той гістарычнай вызваленчай місіі, якая выпала на іх долю. Бярэ слова бывалы салдат, удзельнік першай сусветнай вайны тав. Гарбупоў.

— Я, таварышы,—гаворыць ён,—біў праклятых немцаў яшчэ ў 1914 годзе. З першых дзён Айчыннай вайны я зноў пайшоў на фронт. З кожным днём у мяне ўзрастае прага помсты. Я нядранна біў немчуру, а пасля сёнешняга загада нашага палкаводца таварыша Сталіна я патрою свае намаганні і ўменне. Кожны спарад— у сэрца ворага—вось мой лозунг.

Мітынг, прысвечаны загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна, у падраздзяленні лейтэнанта Загорскага выліўся ва ўрачыстасць. Байцы радаваліся, што вялікі Сталін так высока ацаніў іх баявыя поспехі.

З гарачымі, узнёслымі прамовамі выступілі старшы лейтэнант Камароў, парторг падраздзялення сяржант Суркоў і другія. «Дабʼем гітлераўцаў»—адзінадушна заяўляюць яны.

Такія-ж ажыўленыя мітынгі прайшлі і ў другіх падраздзяленнях часці капітана Берастова.

Мітынг у П-скай вучэбнай часці праходзіў на заснежанай пляцоўцы, недалёка ад поля тактычных запяткаў, дзе маладыя воіны вывучаюць ваенную справу, каб паверняка, без промаху біць ненавіснага ворага.

Пасля зачыткі загада таварыша Сталіна слова бярэ гвардыі капітан, франтавік двойчы ордэнаносец тав. Парталенка.

— Сёння,—гаворыць ён,—разам з совецкім народам доблесную Чырвоную Армію славіць усё свабалюбівае чалавецтва, якое яна выратавала ад фашысцкай чумы...

З гарачай, усхваляванай прамовай выступіў курсант Раманенка.

— Нашы бацькі нядрэнна білі немчуру ў 1914—1918 гг.,—гаворыць ён.—Мы-ж, выхаванцы сталінскіх дзён, павінны біць немцаў яшчэ лепш, яшчэ мацней. Цяпер у кожнага з нас адно жаданне: як мага хутчэй дайсці да Берліна і ўзняць над ім сцяг перамогі. Наблізім-жа, таварышы, гэты жаданы дзень выдатнай вучобай!

Раніцою воінскі эшалон, які ішоў да лініі фронта, спыніўся на станцыі Мінск. З вагонаў высыпалі малодыя байцы, выйшлі іх камандзіры. Гучыць кароткая каманда, і байцы застываюць у чоткім страі. Лейтэнант Назарэнка зачытвае загад таварыша Сталіна, прысвечаны 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

З кароткай прамовай выступае ефрэйтар Лаўранюк, а за ім—малады воін-беларус Засім.

— Я яшчэ не быў на фронце,—гаворыць ён,—і еду туды ўпершыню. Аднак ваенную справу я ведаю нядрэнна: гэтаму мяне навучылі ў запасной часці нашай акругі. Клянуся перад вамі, таварышы, што зраблю ўсё магчымае, каб наблізіць дзень нашай канчатковай перамогі. Жорстка і бязлітасна я буду помсціць гітлераўцам за пакуты і гора, за смерць і слёзы, якія яны прынеслі нашаму беларускаму народу...

Мітынг закончан. Гучыць каманда: «Па вагонах», і эшалон іззе ўперад, на фронт, дзе дабіваецца германскі фашызм.

НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС КАНЧАТКОВАЙ ПЕРАМОГІ НАД ВОРАГАМ

З пачуццём глыбокай радасці і гордасці мы праслухалі па радыё, а пасля прачыталі ў газетах загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна ў сувязі з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі. У загадзе Галоўнакамандуючага з вялікай яскравасцю гаворыцца аб гістарычных перамогах Чырвонай Арміі, якая не толькі вызваліла родную зямлю ад гітлераўскай нечысці, але і адкінула ворага на сотні кіламетраў за тыя рубяжы, з якіх немцы па-разбойніцку напалі на нашу краіну. Чырвоная Армія перанесла вайну на тэрыторыю Германіі і цяпер разам з арміямі нашых саюзнікаў паспяхова завяршае справу разгрому гітлераўскіх армій.

Толькі за 40 дзён наступлення ў студзені—лютым гэтага года нашы доблесныя воіны выгналі немцаў з 300 гарадоў, захапілі да сотні ваенных заводаў, знішчыўшы за гэты кароткі тэрмін да 800 тысяч і захапіўшы ў палон звыш 350 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. На чацвертым годзе вайны Чырвоная Армія стала мацней і сільней, чым калі-б там ні было, яе баявая тэхніка стала яшчэ больш дасканалай, а баявое майстэрства — у многа раз вышэй.

Блізак час канчатковай перамогі над ворагам!

Але перамога, як гаворыць таварыш Сталін, ніколі не прыходзіць сама, — яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы.

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна натхняе нас лепш і гучней песні нашы песні ў народ. Мы прыкладзем усе сілы і здольнасці, каб дапамагчы нашым слаўным воінам хутчэй узняць сцяг перамогі над Берлінам.

Народныя артысты БССР:
ДЗЯНІСАЎ М. І., МЛОДЗЕК Р. В.,
заслужаная артыстка БССР
МАЛЬКОВА В. М.

АДБУДУЕМ РОДНЫ ЗАВОД

З вялікай радасцю сустрэлі рабочыя завода імені Кірава загад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Чырвонай Арміі. На заводзе адбыўся шматлюдны мітынг. Выступіўшы на мітынгу начальнік транспартнага цэха тав. Кітайчык сказаў:

— 27 год таму назад, калі арганізавалася наша Чырвоная Армія, я быў камандзірам эскадрона рэволюцыйна-кавалерыйскага палка ў Ленінградзе. У часе грамадзянскай вайны быў удзельнікам многіх баёў з інтэрвентамі. Тры маіх сыны на франтах Айчыннай вайны змагаліся з нямецкімі акупантамі. Усе яны палі смерцю храбрых. Зараз я інвалід другой групы, але вярнуўся на прадпрыемства. Завод наш заўсёды быў перадавым. У адказ на загад правадыра мы, рабочыя, абавязваемся аддаць усе свае сілы, каб хутчэй і поўнасцю аднавіць наш любімы завод, разбураны нямецкімі бандытамі. Чатыры цэхі ўжо адноўлены.

Былы партызан, токар-стаханавец тав. Германовіч, у сваім выступленні заявіў:

— Фашысцкія бандыты вешалі, расстрэльвалі, палілі на вогнішчах патрыётаў нашай Радзімы. Яны хацелі зрабіць нас пакорнымі нявольнікамі, паставіць на калені. Наша гераічная Чырвоная Армія прайшла пабеданосным маршам тысячы кіламетраў, вызваліўшы і ачысціўшы нашу Радзіму ад фашысцка-нямецкага ярма. Чырвоная армія адкрыла шлях да сэрца фашысцкага звера—Берліна. Загад правадыра натхняе нас на працоўныя подвігі. Мы, рабочыя, абавязваемся працаваць на прадпрыемстве яшчэ лепш, падняць прадукцыйнасць працы. Я асабіста абавязваюся выконваць вытворчае заданне на 200 процантаў.

(БЕЛТА).

Стаханаўскія ўзоры работы

КРЫЧАЎ, 24 лютага. (БЕЛТА). З вялікім задавальненнем сустрэлі працоўныя раёна і горада загад таварыша Сталіна ў сувязі з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі. Ужо днём 23 лютага ў вітрыне партка-бінета быў вывешан тэкст загада. Тут увесь час стаялі людзі, яны знаёміліся са зместам загада. Выйшаў спецыяльны нумар раённай газеты з загадам таварыша Сталіна. Тэкст загада трансліраваўся таксама па мясцовай радыёсетцы.

ДАВІД-ГАРАДОК. (БЕЛТА). Працоўныя раёна, у адказ на бліскучыя перамогі Чырвонай Арміі, датэрмінова выканалі план лесанарыхтовак і лесавывазкі першага квартала. Стаханаўскія ўзоры работы паказалі лесарубы і возчыкі Лозінскага сельсавета Берчук, Кавалёў і другія.

ТАЛОЧЫН. (БЕЛТА). Калгаснікі раёна пачалі збор сродкаў для аказання дапамогі сельгасарцелям, якія асабліва пацярпелі ад фашысцкай акупацыі. Ужо сабрана больш 15 тысяч пудоў збожжа і 500 тон бульбы.

Віншаванні таварышу І. В. Сталіну ад замежных дзяржаўных дзеячоў з выпадку 27-й гадавіны Чырвонай Арміі

Яго Прэвасхадзіцельству Іосіфу В. Сталіну, Вярхоўнаму Камандуючаму ўзброенымі сіламі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

У чаканні нашай агульнай перамогі над нацысцкімі прыгнятальнікамі я хачу скарыстаць гэты выпадак, каб прынесці Вам, як Вярхоўнаму Камандуючаму, мае самыя шчырыя віншаванні з дваццаць сёмай гадавінай стварэння Чырвонай Арміі. Важнейшыя рашэнні, якія мы прынялі ў Ялце, паскорэць перамогу і закладку трывалага фундамента працяглага міру. Няспынныя выдатныя перамогі Чырвонай Арміі разам з разгорнутымі намаганнямі ўзброеных сіл Аб'еднаных Нацый па поўдні і на захадзе забяспечваюць хуткае дасягненне нашай агульнай мэты — жывучага ў спакоі свету, які апіраецца на ўзаемаразуменне і супрацоўніцтва.

Франклін Д. РУЗВЕЛЬТ.

Пасланне Маршалу І. В. Сталіну ад пана У. Чэрчыля

Чырвоная Армія святкуе сваю дваццаць сёмую гадавіну ў абстаноўцы перамог, якія заваявалі бязмежнае захапленне яе саюзнікаў і вырашылі лёс германскага мілітарызма. Будучыя пакаленні будуць лічыць сябе ў даўгу перад Чырвонай Арміяй настолькі-ж безагаворачна, як і мы, якім давялося быць сведкамі гэтых цудоўных подвігаў. Прашу Вас, Вялікага Правадыра Вялікай Арміі, вітаць яе ад мяне сёння, на парозе канчатковай перамогі.

Пану Маршалу Сталіну

У барацьбе і перамозе святкуе сёння Чырвоная Армія сваё свята. Я прашу Вас, Пан Маршал, перадаць слаўным арміям, якімі Вы камандуеце, выражэнне ўдзячнасці і захаплення армій і народа Францыі.

Генерал де ГОЛЬ.

Маршалу Совецкага Саюза І. В. Сталіну

У дзень 27-й гадавіны Чырвонай Арміі Галоўнае Камандаванне Войска Польскага ад імені ўсяго войска шле Вам, Маршалу доблеснай Чырвонай Арміі, палкае віншаванне.

Войска Польскае перадае Вам, Маршал, віншаванне з бязмежнай удзячнасцю за вызваленне зямель польскіх і польскага народа з-пад гітлераўскай няволі. Войска Польскае ніколі не забудзе, што яно адрадзілася і вырасла дзякуючы Вашым асабістым клопатам і падтрымцы брацкай доблеснай Чырвонай Арміі на палях бітваў.

Няхай жыве дружба польскага народа і народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве доблесная Чырвоная Армія і яе геніяльны правадыр Маршал Сталін!

Няхай жыве баявое садружаства доблеснай Чырвонай Арміі і Войска Польскага!

Галоўнакамандуючы Войска Польскага
генерал-палкоўнік РОЛЯ-ЖЫМЕРСКІ.
Начальнік Галоўнага штаба Войска Польскага
генерал-лейтэнант КОРЧЫЦ.

АД СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) з жалем паведамляюць аб смерці выдатнага рускага пісьменніка, найталенавітага мастака слова, палкага патрыёта нашай Радзімы, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР Аляксея Нікалаевіча ТАЛСТОГА.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР.
Цэнтральны Камітэт ВКП(б).



Мінск. 23 лютага 1945 года.
Салют у ганаменаванне вялікіх перамог, атрыманых Чырвонай Арміяй над нямецкімі захопнікамі. Фото А. Карэйскага.

У СОЎНАРКОМЕ СССР І ЦК ВКП(б)

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначаюць, што калгасы, МТС і соўгасы ў цяжкіх умовах вайны забяспечылі ў 1944 годзе правядзенне веснавой сяўбы ў больш сціслыя тэрміны, пры лепшай якасці палявых работ, больш арганізавана завяршылі ўборку ўраджаю, дабіліся павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, што забяспечыла павелічэнне валавых збораў і дзяржаўных нарыхтовак збожжа, бульбы, гародніны, буракоў, бавоўны, ільновалакна, маслічных і іншых сельскагаспадарчых культур.

Гэтых поспехаў сельская гаспадарка дабілася на аснове павышэння працоўнай актыўнасці калгаснага сялянства і рабочых соўгасаў, а таксама палепшання работы машынна-трактарных станцый.

«Чырвоная Армія на чацвертым годзе вайны, дзякуючы клопатам калгаснага сялянства, не адчувае недахопу ў прадавольстве. Калгаснікі і калгасніцы забяспечваюць рабочых і інтэлігенцыю прадавольствам, а прамысловасць сыравінай, забяспечваюць нармальную работу заводаў і фабрык, якія выробляюць узбраенне і снарадзенне для фронту. Наша калгаснае сялянства актыўна і з поўным усведамленнем свайго абавязку перад Радзімай садзейнічае Чырвонай Арміі ў дасягненні перамогі над ворагам» (Сталін).

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) асабліва адзначаюць патрыятычны ўздым калгаснікаў і іх дапамогу Чырвонай Арміі ў справе канчатковага разгрому нямецкіх захопнікаў, якія выразіліся ў тым, што калгасы многіх абласцей і рэспублік, па пачыну калгаснікаў вызваленай ад нямецкіх захопнікаў Украіны, унеслі ў 1944 годзе ў фонд Галоўнага Камандавання Чырвонай Арміі вялікую колькасць хлеба, бульбы і іншых прадуктаў звыш устаноўленых планаў нарыхтовак.

Соўнарком СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначаюць значныя поспехі мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, калгаснікаў і калгасніц, работнікаў МТС і соўгасаў Маскоўскай, Калінінскай, Іванаўскай, Яраслаўскай, Архангельскай, Кіраўскай, Балагодскай абласцей, а таксама вызваленых ад нямецкіх захопнікаў Украінскай, Беларускай, Малдаўскай ССР, Курскай, Арлоўскай і Бранскай абласцей у справе ўзьмеху і адпаўлення сельскай гаспадаркі. Раёны, вызваленыя ад нямецкай акупацыі, не гледзячы на велізарныя страты, нанесеныя сельскай гаспадарцы нямецкімі захопнікамі, дабіліся поспехаў выканання плана веснавой сяўбы, добра правялі догляд пасеваў і ўборку ўраджаю, забяспечылі атрыманне высокага ўраджаю збожжавых і тэхнічных культур, выканалі абавязацельствы па здачы сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

Побач з гэтым, Соўнарком СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначаюць, што совецкія, партыйныя і зямельныя органы раду абласцей, краёў, рэспублік, у асаблівасці Алтайскага края, Новасібірскай, Куйбышэўскай, Ульянаўскай абласцей, Мардоўскай і Татарскай АССР не забяспечылі ў 1944 годзе выканання плана работ, а таксама належнай якасці палявых работ і выканання заданняў па павышэнню ўраджайнасці і здачы сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

Совецкія, партыйныя і зямельныя органы рэспублік, краёў і абласцей Сібіры, Урала, Паўднёвага Усхода і Казахстана далусцілі зніжэнне пасеўных плошчаў і таварнасці сельскагаспадарчых культур, што ставіць пад сумнеў выкананне плана веснавой сяўбы ў 1945 годзе.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) лічаць галоўнай задачай калгасаў, МТС, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у 1945 годзе ўсямернае павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.

Для паспяховага вырашэння гэтай задачы совецкія і партыйныя арганізацыі, калгасы, МТС і соўгасы павінны сканцэнтраваць намаганні на правядзенні наступных важнейшых мерапрыемстваў:

Забеспячэнне своечасовай падрыхтоўкі да веснавых палявых работ калгасаў, МТС і соўгасаў для паспяховага выканання дзяржаўнага плана пасеву яравых культур, павышэнне якасці палявых работ, палепшанне агратэхнікі вырошчвання ўсіх сельскагаспадарчых культур і, перш за ўсё, своечасовае правядзенне веснавой сяўбы па добра падрыхтаваных землях, сяўба добраякасным насеннем і забеспячэнне належнага догляду пасеваў.

Асаблівая ўвага ў 1945 годзе павінна быць звернута на выкананне заданняў па ўзорванню і апрацоўцы папараў пад азімыя ва ўсіх раёнах СССР, а ва ўсходніх раёнах і пад яравую пшаніцу, а таксама на выкананне плана падсёву зяблева ў калгасах і соўгасах.

Правядзенне своечасовай падрыхтоўкі трактараў, сельскагаспадарчых машын і жывога цягла калгасаў, МТС і соўгасаў, падрыхтоўкі кадраў трактарыстаў, камбайнераў, механікаў, брыгадзіраў трактарных брыгад, умацаванне калгасных брыгад і палепшанне арганізацыі работы звеньняў, упарадкаванне ўліку працы і прадукцыі, а таксама ўсямернае павелічэнне вырабу запасных частак да трактараў і сельскагаспадарчых машын на прамысловых прадпрыемствах, якія знаходзяцца ў рэспубліках, краях і абласцях.

Правільнае размяшчэнне сельскагаспадарчых культур па раёнах і калгасах з улікам прыродных і эканамічных умоў (забеспячэнне цяглом і рабочай сілай, наяўнасць прадпрыемстваў, якія перапрацоўваюць сыравіну), правільнае планаванне заданняў калгасам і соўгасам па ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, адпаўленне парушаных і ўвядзенне новых севазваротаў з забеспячэннем правільнага размяшчэння сельскагаспадарчых культур на лепшых папярэдніках, палепшанне гатункавага насенніцтва па збожжавых, тэхнічных і гародніных культурах і травах.

Усямернае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне МТС, калгасаў і соўгасаў, адпаўленне пасеўных плошчаў, упарадкаванне землекарыстання ў калгасах, адпаўленне гатункавага насенніцтва і пасеваў разнараванымі гатункамі, а таксама распырэнне пасеваў шматгадовых траў, асабліва ў раёнах, вызваленых ад нямецкіх захопнікаў.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) патрабуюць ад прамысловых наркаматаў безумоўнага выканання ўстаноўленых планаў вырабу трактараў, сельскагаспадарчых машын, запасных частак да іх, конна-ручнога інвентару, угнаенняў і сілікатаў, а таксама выканання планаў перавозак і забеспячэння сельскай гаспадаркі нафтапрадуктамі.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанавілі:

I. Аб плане сельскагаспадарчых работ

1. Зацвердзіць пасеўную плошчу ўсіх сельскагаспадарчых культур пад ураджай 1945 года па ўсёй сельскай гаспадарцы з павелічэннем на 8,1 мільёна гектараў у параўнанні з 1944 годам, у тым ліку па калгасах на 5,9 мільёна гектараў, па соўгасах і падсобных гаспадарках на 0,6 мільёна гектараў.

2. Зацвердзіць па калгасах, соўгасах, падсобных гаспадарках прамысловых наркаматаў і сялянскіх гаспадарках план сяўбы яравых культур на 1945 год, план сяўбы азімых культур пад ураджай 1946 года, план агратэхнічных мерапрыемстваў, план трактарных работ МТС, план ураджайнасці збожжавых, тэхнічных культур і бульбы, план насенніцтва гародніных культур і кармавых коренеплодаў, план закладкі насенніцтваў шматгадовых і аднагадовых траў, план уборкі прыродных сенажацей і закладкі сілосу, план закладкі плода-ягадных і вінаградных насаджэнняў па рэспубліках, краях і абласцях.

3. Зацвердзіць план сяўбы яравых і азімых культур па палінных, заложных і пераложных землях калгасаў Урала, Сібіры, Паволжжа і Казахскай ССР.

4. Зацвердзіць на 1945 год сабекошт аднаго гектара трактарных работ МТС у пераводзе на мяккае ворыва ў памеры 39 рублёў, у тым ліку затраты на капітальны і бягучы рамонт трактараў, камбайнаў і сельскагаспадарчых машын 8 рублёў.

Абавязаць Наркамфін СССР (тав. Зверэва), апрача таго, прадугледзець у бюджэце на 1945 год 42 мільёны рублёў на капітальны рамонт будынкаў і абсталявання МТС.

Дазволіць Наркамзему СССР выдаткаваць у 1945 годзе за кошт агульнага каштарыса Наркамзема СССР 11,6 мільёна рублёў на выплату заработнай платы работнікам машынна-трактарных пракатных пунктаў пры МТС Латвійскай, Літоўскай і Эстонскай ССР.

Дазволіць Наркамзему СССР у межах зацверджаных затрат на рамонт устанавіць на 1945 год дыферэнцыраваныя нормы адлічэнняў на рамонт трактараў, камбайнаў і сельскагаспадарчых машын па абласцях, краях і рэспубліках.

5. Зацвердзіць план сельскагаспадарчых работ у сялянскіх гаспадарках Латвійскай, Літоўскай, Эстонскай ССР і заходніх раёнах Украінскай, Беларускай і Малдаўскай ССР.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) абавязаць совецкія, партыйныя і зямельныя органы Латвійскай, Літоўскай і Эстонскай ССР, а таксама заходніх раёнаў Украінскай, Малдаўскай і Беларускай ССР забяспечыць арганізацыйную і выхаваўчую дапамогу сялянскім гаспадаркам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, яе правядзенні і выкананні іншых сельскагаспадарчых работ, а таксама адкавіць машынна-трактарныя станцыі і арганізаваць работу машынна-конных пракатных пунктаў.

6. Абавязаць Наркамзем СССР, Наркомсоўгасаў СССР, Соўнаркомы рэспублік, край(абл)выканкомы і наркаматы, у якіх устаноўлен план сельскагаспадарчых работ па соўгасах і падсобных гаспадарках:

а) у адпаведнасці з зацверджаным гэтай Пастановай для рэспублікі, края і вобласці дзяржаўным планам давесці ў дзелавіцёнкі тэрмін да раёнаў, соўгасаў, МТС, калгасаў, калгаснікаў і сялянскіх гаспадарак заданні па плану сельскагаспадарчых і трактарных работ на 1945 год;

б) на аснове ўстаноўленай гэтай Пастановай сярэдняй ураджайнасці збожжавых культур зацвердзіць заданні па ўраджайнасці асобных збожжавых культур, а таксама заданні па ўраджайнасці тэхнічных, гародніных, бахчавых, кармавых і плодаягадных культур, па якіх ураджайнасць гэтай Пастановай не зацверджана;

в) зацвердзіць план па закладцы і новаму будаўніцтву парнікоў і пяцін, па лесапасадачных работах, тутаводству, па закладцы субтропічных і чайных плантацый, палепшанню сенажацей і выпасаў;

г) зацвердзіць заданні для раёнаў і калгасаў па пасеўных плошчах і ўраджайнасці на палінных землях, забеспячэнне якасці палявых работ і павышэння ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі Наркамзем СССР, Наркомсоўгасаў СССР, Наркомхарчпром СССР, Наркоммясамолпром СССР, мясцовыя партыйныя, совецкія і зямельныя органы, прадугледзець у сваіх планах перавозкі гаручага, мастэрняў, запчастак, інструмента, інвентару, трактараў, сельскагаспадарчых машын і прылад, а таксама ўлікам наяўнасці рабочай сілы і цягла, не дапускаючы пры гэтым перагрузкі тэхнічнымі і прапашнымі культурамі асобных калгасаў.

II. Аб падрыхтоўцы да веснавых палявых работ

1. Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі совецкія, партыйныя і зямельныя органы забяспечыць своечасовую падрыхтоўку да веснавой сяўбы калгасаў, МТС і соўгасаў і арганізаванае правядзенне веснавой сяўбы ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны пры добрай якасці палявых работ.

Устанавіць, што асноўнай задачай МТС з'яўляецца далейшае палепшанне скарыстання машынна-трактарнага парка, павышэнне якасці трактарных работ і выкананне ў агратэхнічныя тэрміны выторчых абавязацельстваў перад калгасамі.

2. Абавязаць Наркамзем СССР, Наркомсоўгасаў СССР, соўнаркомы рэспублік, край(абл) выканкомы, ЦК компартый саюзных рэспублік, крайкомы і абкомы ВКП(б) забяспечыць:

а) своечасовы і добраякасны рамонт трактараў і трактарнага інвентару ў кожнай МТС і соўгасе, а таксама рамонт і падрыхтоўку коннага інвентару, транспарта і збруі ў кожным калгасе і соўгасе.

Аказаць дапамогу МТС, калгасам, соўгасам у правядзенні рамонту трактараў, сельскагаспадарчых машын і прылад шляхам пасылкі з гарадоў рамонтных брыгад, выдзялення метала і паліва.

Прыёмку трактараў з рамонту праводзіць дзяржаўнымі камісіямі ў саставе старшыні райвыканкома ці сакратара райкома ВКП(б) (старшыні камісіі), дырэктара і старшага механіка МТС ці соўгаса, старшага механіка суседняй МТС ці соўгаса, а таксама старшага трактарыста, за якім замацаван трактар;

б) правесці да пачатку сельскагаспадарчых работ дзяржаўную праверку гатоўнасці кожнай МТС да веснавых палявых работ камісіямі ў саставе сакратара райкома, старшыні райвыканкома, загадчыка райза і дырэктара другой МТС, звярнуўшы асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку кадраў пры арганізацыі трактарных брыгад, укамплектаванне брыгад прычэпным і заправачным інвентаром, інструментам, спраўнай бочкатарай, запаснымі часткамі і падрыхтоўку МТС да тэхнічнага абслугоўвання трактараў у полі;

в) устанавіць, як правіла, што да самастойнай работы новападрыхтаваныя трактарысты павінны дапускацца толькі пасля прахаджэння імі трохтыднёвай стажыроўкі на палявых работах пад кіраўніцтвам старшага трактарыста.

Звярнуць увагу на перападрыхтоўку і павышэнне тэхнічнай кваліфікацыі трактарыстаў як да пачатку веснавых палявых работ, так і пасля іх заканчэння, шырока прымяняючы індывідуальнае абучэнне;

г) зрабіць да пачатку веснавых палявых работ недастаючую колькасць заправачных цялежак і забеспечыць кожную трактарную брыгаду заправачным інвентаром, інструментам і прыстасаваннямі для тэхнічнага догляду трактараў і сельскагаспадарчых машын;

д) шырока ўкараніць вопыт перадавых трактарных брыгад і калгасаў па пабудове з мясцовых будаўнічых матэрыялаў у трактарных брыгадах сіламі трактарыстаў і калгасаў прасцейшых майстэрань, павесяў для правядзення тэхнічнага догляду трактараў і па пабудове прасцейшых склепаў для хавання гаручага ў брыгадзе;

е) у адпаведнасці з заключанымі МТС з калгасамі дагаворамі, не пазней 1 красавіка 1945 года ўстанавіць для кожнай трактарнай брыгады гадавыя заданні па трактарных работах з указаннем калгасаў, відаў трактарных работ і тэрмінаў іх выканання, склаці рабочыя планы на перыяд веснавых палявых работ, а таксама ўручыць графікі тэхнічнага догляду трактараў і сельскагаспадарчых машын па перыядах сельскагаспадарчых работ.

3. У мэтах ліквідацыі абазлічкі ў рабоце машынна-трактарных станцый і павышэння якасці трактарнай апрацоўкі калгасных палёў абавязаць райкомы партыі, райвыканкомы і дырэктароў МТС да пачатку веснавой сяўбы правесці замацаванне трактарных брыгад на ўвесь перыяд палявых работ у буйных калгасах, як правіла, за паляводчымі брыгадамі, а пры абслугоўванні дробных калгасаў — за адным ці групай калгасаў.

4. У мэтах павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці трактарыстаў у паскарэнні тэрмінаў веснавых палявых работ і палепшання скарыстання трактараў:

а) захаваць на 1945 год выплату прэмій трактарыстам за выкананне ўстаноўленых 15-дзённых заданняў на веснавой сяўбе;

б) захаваць парадак налічэння прадзён трактарыстам у падвойным памеры і павышэння норм выдаткавання гаручага на 10 процантаў у першыя 6 дзён работы на ворыве.

5. Абавязаць соўнаркомы рэспублік, край(абл)выканкомы, райвыканкомы і дырэктароў МТС:

а) навесці парадак у нафтагаспадарцы МТС і ахове нафтапрадуктаў, не дапускаючы іх разбазарвання, незаконнага выдаткавання пад выглядам іншых гаспадарчых патрэб;

б) забяспечыць завоз гаручага ў МТС да пачатку веснавога бездарожжа, аказваючы дапамогу МТС гарадскім транспартам, а таксама шляхам скарыстання зваротных рэйсаў аўтамабіляў і калгасных падвод, занятых на перавозцы сельскагаспадарчых прадуктаў.

6. Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) лічаць, што засыпка і ачыстка насенных фондаў у калгасах і соўгасах у размерах, якія поўнасцю забяспечваюць выкананне ўстаноўленага плана сяўбы на 1945 год, з'яўляецца важнейшай справай і абавязкам партыйных, совецкіх і зямельных органаў абласцей, краёў і рэспублік:

а) забяспечыць да пачатку веснавых палявых работ поўную засыпку ў кожным калгасе насення збожжавых, тэхнічных, гародніных, кармавых культур і бульбы ў памеры, неабходным для выканання ўстаноўленага плана сяўбы, устанавіўшы пільны кантроль за якасцю і захоўнасцю насенных фондаў;

б) правесці абмен насення, не прыгоднага для сяўбы, або радавога насення на гатунковае;

в) правесці ў кожным калгасе поўную ачыстку, сартыроўку і давядзенне да ўстаноўленых кандыцый насенных фондаў па ўсіх культурах, а таксама своечасова праверыць насенне на ўсхожасць, вільготнасць, засмечанасць і заражонасць хваробамі і шкоднікамі;

г) шырока прымяняць ва ўсходніх і паўночных раёнах рэкамендаваны акадэмікам Лысенка метад апрацоўкі ранняй вясной жыцездольнага, але не кандыцыйнага па ўсхожасці насення, шляхам праветрывання і абагравання яго паветрам у тонкім пласце, з наступнай праверкай усхожасці кантрольна-насеннымі лабараторыямі.

7. Абавязаць соўнаркомы рэспублік, край(абл)выканкомы, ЦК компартый саюзных рэспублік, крайкомы і абкомы ВКП(б) забяспечыць:

а) замацаванне рабочых коней і валоў на ўвесь перыяд палявых работ за паляводчымі брыгадамі, а ўнутры брыгад за асобнымі калгаснікамі;

б) забраніраванне на перыяд веснавых палявых работ неабходнай колькасці сена і канцэнтрыраваных кармоў для рабочай жывёлы;

в) заканчэнне не пазней 1 красавіка 1945 года складання вытворча-фінансавых планаў у калгасах, МТС і соўгасах, заключэнне дагавораў МТС з калгасамі, а таксама рабочых планаў трактарных і паляводчых брыгад у калгасах, соўгасах і МТС, прадугледзеўшы ў іх замацаванне за брыгадамі, калгасамі і рабочымі соўгасаў сродкаў вытворчасці, расстаноўку калгаснікаў і рабочых МТС і соўгасаў па асобных відах работ;

г) правядзенне праверкі і аказанне дапамогі калгасам у замацаванні за паляводчымі брыгадамі зямельных участкаў і выдзяленні да пачатку веснавых работ звеньям палявых участкаў у натуры пад сяўбу культур, замацоўваемых за звеньямі;

д) праверку за два тыдні да пачатку палявых работ гатоўнасці кожнага калгаса, МТС і соўгаса да веснавой сяўбы, шырока практыкуючы ўзаемную праверку.

8. Рэкамендаваць калгасам пры недахопе цягавай сілы скарыстаць на лёгкіх палявых і транспартных работах малапрадуктыўных кароў калгасаў і калгаснікаў, забяспечыўшы клапатлівы догляд кароў. На выдзеленых каровах калгаснікаў павінны, як правіла, працаваць калгаснікі, якім належаць гэтыя каровы.

Пры скарыстанні на палявых і транспартных работах кароў калгаснікаў забяспечыць выдзяленне неабходнай колькасці грубых кармоў для гэтых кароў.

9. Абавязаць райвыканкомы, райкомы партыі, праўленні калгасаў і дырэктароў соўгасаў забяспечыць абавязковы ўдзел у сельскагаспадарчых работах усяго працаздольнага ў калгасах і на тэрыторыі калгасаў працаздольнага насельніцтва—калгаснікаў і членаў іх сем'яў, рабочых, служачых соўгасаў і членаў іх сем'яў, а таксама іншага працаздольнага насельніцтва з некалгаснікаў, не занятага на работах у прамысловасці і на транспарце.

10. За месяц да пачатку палявых работ вызваліць калгасы ад працугжпавіннасці і забараніць без рашэння Соўнаркома СССР якія-небудзь мабілізацыі цягавай сілы з калгасаў. Не пазней, чым за тры тыдні да пачатку палявых работ, паставіць жывое цягло на ўзмоцнены падкорм і адпачынак. Асоб, вінаўных у незаконнай мабілізацыі жывой цягавай сілы з калгасаў, прыцягваць да крымінальнай адказнасці.

11. Забараніць без рашэння Соўнаркома СССР скарыстанне трактараў на транспартных і іншых непалявых работах, за выключэннем падвозу гаручага для МТС.

III. Аб мерах павышэння ўраджайнасці

У мэтах далейшага палепшання якасці палявых работ і павышэння ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі Наркамзем СССР, Наркомсоўгасаў СССР, Наркомхарчпром СССР, Наркоммясамолпром СССР, мясцовыя партыйныя, совецкія і зямельныя органы, праўленні калгасаў, дырэктароў МТС і соўгасаў правесці наступныя важнейшыя мерапрыемствы:

1. У кожным калгасе і соўгасе да пачатку веснавых палявых работ распрацаваць сіламі агранамічнага персанала сумесна з праўленнямі калгасаў, дырэктарамі соўгасаў і вопытнымі калгаснікамі канкрэтныя агратэхнічныя мерапрыемствы па правядзенню веснавой сяўбы і догляду пасеваў у 1945 годзе.

Прадугледзець у гэтых мерапрыемствах правільнае размяшчэнне ўсіх культур у палях севазваротаў, а дзе севазваротаў няма, па лепшых для кожнай культуры папярэдніках, палепшанне якасці перадпасеўнай апрацоўкі палёў і правядзенне сяўбы ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны для кожнай культуры з дакладнай задзелкай насення, максімальнае скарыстанне мясцовых угнаенняў, правядзенне ў больш шырокіх размерах мер барацьбы з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі сельскагаспадарчых культур, палепшанне догляду пасеваў і апрацоўкі прапашных культур, асабліва такіх важнейшых культур, як бавоўна, цукровыя буракі, сланечнік, лёндаўгунец, каноплі, бульба і гародніна.

Забараніць каму-б там ні было адмяняць або змяняць устаноўленыя калгасамі сумесна з агранамамі агратэхнічныя мерапрыемствы без ведама агранома, які ўстанавіў гэтыя мерапрыемствы, або без дазволу галоўнага агранома раённага земельнага аддзела, а па соўгасах без дазволу галоўнага агранома трэста.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) асабліва звяртаюць увагу на неабходнасць безумоўнага выканання дзяржаўных планаў падсёву і апрацоўкі чыстых папараў і ворыва зяблева, без чаго нельга ліквідаваць вялікую засмечанасць палёў у многіх раёнах, якая ўтварылася за час вайны, і дабіцца сур'ёзнага павышэння ўраджайнасці.

2. У мэтах забеспячэння ўстойлівага і высокага ўраджаю ў калгасах і соўгасах засушлівых і поўзасушлівых раёнаў СССР абавязаць мясцовыя совецкія, партыйныя органы, праўленні калгасаў, дырэктароў МТС і соўгасаў гэтых раёнаў мабілізаваць усе сілы і сродкі калгасаў, МТС і соўгасаў, перш за ўсё, на максімальнае накапленне і зберажэнне вільгаці ў глебе і прымяненне агратэхнікі, якая забяспечвае атрыманне ў 1945 годзе высокага ўраджаю ў калгасах і соўгасах, для чаго:

а) праверыць па раёнах, а ў раёнах па калгасах і соўгасах ход работ па снегазатрыманню і прыняць дадатковыя меры па ўзмацненню гэтай работы;

б) шырока арганізаваць на палях калгасаў і соўгасаў затрымане веснавых талых вод;

в) забяспечыць правядзенне на зяблеве, чорных папарах, а таксама на ўчастках пасля прапашных культур, не ўзораных з восені, баранаванне ў 1—2 сляды з тым, каб паверхня глебы была прыкрыта рыхлым (засперагаючым ад высушвання) пластам глебы не менш 1—2 сантыметраў.

На ўчастках, якія падлягаюць веснавому ворыву, а таксама прызначаны для ворыва пад папар, закрываць у першыя веснавыя дні вільгаць шляхам мелкага, на глыбіню 3—5 см., лушчэння-рыхлення глебы ў 1—2 сляды.

З той прычыны, што барацьба за захаванне вільгаці і знішчэнне пустазелля з'яўляецца адным з важнейшых мерапрыемстваў барацьбы за ўраджай, скарыстаць усю наяўнасць трактараў і жывога цягла адразу-ж па меры падсыхання глебы для закрыцця вільгаці;

г) правесці мерапрыемствы, якія забяспечваюць своечасовы рамонт у калгасах, МТС і соўгасах шыроказахватных трактарных і конных глебаапрацоўчых прылад (лушчыльнікі, дыскавыя бораны, пшанічныя плугі, культыватары, драпачы, драўляныя бораны з даўгімі жалезнымі зубамі і г. д.) і ўстанавіць заданні прадпрыемствам мясцовай прамысловасці, МТС, МТМ, соўгасам і калгасным кузням па рамонту, аднаўленню і вырабу новых прасцейшых прылад для рыхлення-лушчэння глебы;

д) палі, засмечаныя карнявішчавым і корнеадросткавым пустазеллем (пырнік, асот і іншыя), араць вясной у першую чаргу на нармальную глыбіню. На папярэдне ўлушчаных, абрыхленых палях, калі яны не засмечаны карнявішчавым і корнеадросткавым пустазеллем, а адпагадовае пустазелле (аўсюг і інш.) ужо далі ўсходы, у мэтах паскарэння сяўбы дапускаць ворыва на глыбіню 10 — 12 сантыметраў з добрым абаротам пласта, правёўшы баранаванне ўслед за ворывам, забараніўшы без папярэдняга лушчэння-рыхлення ворыва на глыбіню 10—12 сантыметраў;

е) рэкамендаваць калгасам і соўгасам засушлівых раёнаў пабудаваць сваімі сіламі вадаёмы шляхам запруды яраў, мелкіх рэчак, раўчукоў, ачысткі старых сажалак і арганізаваць у кожным калгасе, дзе гэта магчыма, палёўныя ўчасткі размерам у 5—15 гектараў для страхавых пасеваў на іх бульбы, гародніны і іншых сельскагаспадарчых культур, устанавіўшы канкрэтныя заданні раёнам і калгасам па будаўніцтву вадаёмаў.

3. Абавязаць совецкія, партыйныя і зямельныя органы:

а) у раёнах Паўднёвага Усхода, а таксама ў іншых засушлівых і поўзасушлівых раёнах, за выключэннем поўзасушлівых раёнаў Сібіры, Урала і паўночных абласцей Казахскай ССР, па меры паспявання глебы на асобных участках адразу-ж рабіць на зяблеве перапасеўную нарыхтоўку глебы і сяўбу або веснавое ворыва і сяўбу, не дапускаючы разрыву паміж веснавым ворывам і баранаваннем, а таксама запазнівання з сяўбой яравой пшаніцы і іншых ранніх яравых культур. Адначасова з гэтым прадаўжаць закрыццё вільгаці на ўчастках, дзе яна не была закрыта з-за высокай вільготнасці глебы;

б) у поўзасушлівых раёнах Сібіры, Урала і паўночных абласцях Казахстана прыняць усе меры да таго, каб у красавіку закрыць вільгаць на зяблеве, як мага больш узараць і забаранаваць плошчаў, падлягаючых сяўбе, закрыць вільгаць на ўчастках, якія будуць узорваца ў маі. Сяўбу яравой пшаніцы, у першую чаргу позніх гатункаў, пачаць з апошніх лічбаў красавіка з тым, каб закончыць яе да 15—20 мая. Сяўбу аўса ў гэтых раёнах рабіць з другой дэкады мая.

Участкі, засмечаныя аўсюгам, дзікімі каноплямі, пальном і іншым насенным пустазеллем, пасля ранневеснавога перадворыўнага лушчэння ва ўказаных раёнах узорваць у маі адразу-ж пасля масавага паяўлення ўсходаў пустазелля і неадкладна рабіць сяўбу.

Участкі, засмечаныя карнявішчавым і корнеадросткавым пустазеллем, узорваць вясной у першую чаргу на нармальную глыбіню;

в) у раёнах Сібіры, Урала і Паўночнага Казахстана, дзе познія пасевы не выспяваюць або пападаюць пад замаразкі, заканчваць поўнасцю веснавую сяўбу не пазней 10 чэрвеня.

4. Забяспечыць своечасовае правядзенне догляду пасеваў азімых культур у веснавы перыяд: баранаванне пасеваў, падкормку іх, а таксама праполку пасеваў, уключыўшы гэтыя мерапрыемствы ў рабочыя планы веснавой сяўбы.

На пасевах азімых па іржэўніку ў стэпавых раёнах Сібіры і Паўночнага Казахстана, дзе палі пападаюць пад ветравую эрозію (выдуванне), веснавога баранавання не праводзіць, але забяспечыць праполку азімых вясной асабліва ад усходаў палыну.

5. Удзяліць асаблівую ўвагу палепшанню догляду пасеваў, у асаблівасці прапашных культур, аказаць дапамогу калгасам і соўгасам шляхам пасылкі з гарадоў і райцэнтраў працаздольнага насельніцтва і моладзі для правядзення праполачных работ і міжрадковай апрацоўкі прапашных культур.

6. У мэтах максімальнага скарыстання ўгнаенняў абавязаць совецкія, партыйныя і зямельныя органы рэспублік, краёў, абласцей і раёнаў:

а) устанавіць для кожнага калгаса план унясення мясцовых угнаенняў у 1945 годзе з указаннем угнойваемай плошчы, прадугледзеўшы поўнае скарыстанне гною, перагною, гноевай жыжы, попелу, птушынага памёту і іншых угнаенняў і першачарговае іх уняслене пад тэхнічныя і гароднінныя культуры, бульбу, насенныя ўчасткі збожжавых культур, а таксама ў папары пад азімае збожжа;

б) арганізаваць у калгасах, размешчаных паблізу тарфянікаў, шырокае скарыстанне торфу на ўгнаенне і кампастыраванне торфу з гноем, гноевай жыжай, фекаліямі і іншымі ўгнаеннямі;

в) арганізаваць скарыстанне на ўгнаенне адкідаў прамысловасці і бытавых адкідаў гарадоў, аказваючы калгасам дапамогу гарадскім транспартам для вывазкі гэтых угнаенняў;

г) забяспечыць вывазку мінеральных угнаенняў са складаў сельгаснаба, прыстанцыйных і прыстанскіх пунктаў і скарыстанне іх у першую чаргу пад тэхнічныя культуры і на абвадняемых землях.

7. Абавязаць Наркамзем СССР, совецкія, партыйныя і зямельныя органы забяспечыць выдзяленне ва ўстаноўленых размерах насенных участкаў па кожнай культуры ў кожным калгасе да пачатку веснавой сяўбы і замацаванне гэтых участкаў за асобнымі звеньямі, правядзенне на выдзеленых насенных участках высокай агратэхнікі — сяўба лепшым гатункавым насеннем па зяблеваму ворыву або папарах у лепшыя агратэхнічныя тэрміны, а таксама правядзенне належнага догляду пасеваў на насенных участках і афармленне актамі выдзеленых участкаў.

Ускласці адказнасць за правільнае выдзяленне і захаванне ўстаноўленай агратэхнікі на насенных участках у калгасах на агранамаў-насеннаводаў райземаддзелаў і старшынь калгасаў.

8. На працягу 1945 г. правесці ва ўсіх калгасах, якія маюць севазвароты, праверку захоўнасці ў натуры межаў палёў і межавых знакаў і правільнасці размяшчэння культур у адпаведнасці з прынятым чаргаваннем.

У калгасах, дзе севазвароты не асвоены і дзе няма пераходных планаў або фактычнае размяшчэнне пасеваў у 1944 годзе не адпавядала ім, склаці або ўдакладніць план пераходу да севазваротаў, а таксама аднавіць заараныя межы і знішчаныя межавыя знакі.

9. У мэтах хутчэйшага асваення севазваротаў і шырокага прымянення ў іх рэкамендаваных акадэмікам Вільямсам пасеваў травасумесі бабовых і злакавых шматгадовых траў забяспечыць з 1945 года сяўбу на насенне шматгадовых траў у кожным калгасе і соўгасе з тым, каб у бліжэйшыя 2 — 3 годы калгасы і соўгасы маглі поўнасцю абсемяніць поле траў у севазваротах сваім насеннем. Арганізаваць агратэхнічную дапамогу калгасам у справе авалодання агратэхнікай шматгадовых траў, атрымання высокіх ураджаяў сена і насення траў і больш хуткага асваення севазваротаў. Выдзеліць у 1945 годзе ў калгасах і соўгасах з плошчы шматгадовых траў у пачатку веснавога адрастання ўчасткі з лепшым для атрымання насення травастоем, устанавіць належны догляд яго, звярнуўшы асаблівую ўвагу на выяўленне і выдзяленне на насенне травастою мясцовых высокаўрад-

(Працяг на 3-й стар.).

У СОЎНАРКОМЕ СССР І ЦК ВКП(б)

(Працяг. Пачатак на 2-й стар.).

кайных і зімастойкіх гатункаў шматгадовых траў.

10. Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) ставяць у якасці асноўнай задачы соўнаркомаў рэспублік, край(абл)выканкомаў, ЦК компартый, абкомаў і крайкомаў партыі раёнаў Паўднёвага Усхода, Урала, Казахстана і Сібіры аднаўленне ў кароткія тэрміны пасеўных плошчаў і ўраджайнасці яравой пшаніцы да даваеннага ўраджаю і абавязваюць прыняць усе неабходныя меры да безумоўнага выканання ўстаноўленага плана сяўбы яравой пшаніцы ў 1945 годзе.

11. У мэтах хутчэйшага аднаўлення пасеваў яравой пшаніцы дазволіць калгасам павялічыць у 1945 годзе размеры насенных участкаў яравой пшаніцы да 20 процантаў ад фактычнай пасеўнай плошчы па Куйбышэўскай, Пензенскай, Саратаўскай, Сталінградскай, Тамбоўскай, Ульяноўскай, Кемераўскай, Курганскай, Новасібірскай, Омскай, Томскай, Тюменьскай, Іркуцкай, Молатаўскай, Чэлябінскай, Чыцінскай і Чкалаўскай абласцях, Алтайскаму, Хабараўскаму і Краснаярскаму краях, Башкірскай і Татарскай АССР, Казахскай ССР.

12. Устанавіць, што пасевы яравой пшаніцы размяшчаюцца ў першую чаргу па пласту і абароту пласта ў палінных і доўгагадовых залежных землях, узараных пад папары або зяблева, па пласту і абароту пласта шматгадовых траў, узараных на зяблева, а таксама пасля азімых, пасевы якіх рабіліся па чыстых папарах.

Абавязаць Наркамзем СССР, Наркомсоўгасаў СССР, край(абл)выканкомы і соўнаркомы рэспублік забяспечыць у бліжэйшыя 2 — 3 годы пераход калгасаў і соўгасаў да сяўбы яравой пшаніцы па зяблеву і папарах.

Устанавіць, што да ворыва папараў пад азімыя культуры і яравую пшаніцу ва ўсходніх раёнах трэба прыступаць па меры заканчэння веснавой сяўбы, з тым, каб закончыць ворыва не пазней 15 ліпеня.

Абавязаць соўнаркомы рэспублік, край(абл)выканкомы і дырэктароў МТС забяспечыць па меры вызвалення жывой цягавай сілы і трактараў на веснавой сяўбе выдзяленне адпаведнай колькасці трактараў і жывога цягла на пад'ём папараў з тым, каб закончыць іх ворыва ва ўстаноўленыя тэрміны.

13. У мэтах павышэння ўраджайнасці грэчкі абавязаць мясцовыя совецкія, партыйныя і зямельныя органы: звярнуць асаблівую ўвагу на забеспячэнне правільнай перадпасеўнай апрацоўкі глебы на ўчастках, якія адводзяцца пад сяўбу грэчкі, правядзенне ў ранніх тэрміны пакроўнага баранавання, культывацыі зяблева, веснавога ворыва і знішчэння пустазелля шляхам дадатковых культывацый да сяўбы грэчкі. Рэкамендаваць калгасам праводзіць сяўбу грэчкі ў 2—3 тэрміны, каб пазбегнуць вялікіх пашкоджанняў пасеваў ад неспрыяльных умоў вясны і лета. Пашырыць прымяненне ў калгасах вывазкі пчол у вуллях на палі, засеяныя грэчкай.

IV. Па павышэнню ўраджайнасці бавоўніка

1. Лічачы, што якасць сельскагаспадарчых работ, праводзімых на працягу ўсяго года, з'яўляецца важнейшай задачай у справе ўзняцця ўраджайнасці бавоўніка абавязаць совецкія, партыйныя і зямельныя органы бавоўнасеючых раёнаў забяспечыць выкананне наступных агратэхнічных мерапрыемстваў:

а) правядзенне абавязковага двухразовага веснавога ворыва на палях, выдзеленых пад пасевы бавоўніка і не ўзараных пад зяблева, а на ўчастках, узараных пад зяблева, абавязковага веснавога перавор вання з паследуючым чызелаваннем моцна ўшчыльненых глебаў;

б) давядзенне ў 1945 годзе плошчы пасеву бавоўніка трактарнымі сеялкамі не менш, чым да 80 процантаў агульнага пасеву, а таксама правядзенне трактарамі культывацыі на ўсёй плошчы трактарнай сяўбы, прадугледзеўшы пры гэтым трактарную або конную перакрыжаваную апрацоўку на плошчы не менш 40 процантаў пасеву бавоўніка;

в) своечасовае высокаякаснае прарэджванне бавоўніка на ўсёй плошчы пасеву з тым, каб густата стаяння ў залежнасці ад пладародзя глебы складала не менш 75—100 тысяч раслін на гектар;

г) правядзенне за перыяд росту бавоўніка 4 высокаякасных кетменных апрацоўкі і не менш 5 глыбокіх культывацый;

д) праводзіць вегетацыйныя палівы выключна па барознах па ўстаноўленых нормах, не дапускаючы перасыхання глебы пасля паліваў, для чаго міжрадковую апрацоўку бавоўніка рабіць у момант спеласці глебы з тым, каб глеба пад бавоўнікам пастаянна знаходзілася ў нармальна вільготным і глыбока разрыхленым стане.

Даюцца ліквідацыі паліваў бавоўніка затапленнем. У мэтах эканоміі арашальнай вады своечасова праводзіць планіроўку абвадняемых зямель;

е) правесці глыбокае (не менш 25 см.) зяблевае ворыва пад бавоўнік восенню 1945 года на ўсёй плошчы пасеву бавоўніка.

Прадаставіць права Наркамзему СССР у неабходных выпадках дазваляць па хадайніцтвах соўнаркомаў саюзных рэспублік веснавое ворыва пад бавоўнік, а таксама ворыва зяблева двухкорпуснымі плугамі (замест трохкорпусных) з павелічэннем нормы выдатку гаручага да 20 процантаў.

2. Абавязаць соўнаркомы Узбекскай і Туркменскай ССР аднавіць люцэрнавае насеннаводства ў раёнах Кара-Калпакскай АССР, Харэзмскай обласці Узбекскай ССР і Ташаузскай обласці Туркменскай ССР.

3. У мэтах карэннага палепшання меліяратыўнага становішча абвадняемых зямель, барацьбы з іх засмечаннем і заблачваннем, арганізацыі правільнай эксплаатацыі абвадняемых сістэм і больш поўнага скарыстання абвадняемых зямель пад паліўныя пасевы і насаджэнні, абавязаць соўнаркомы рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы:

а) забяспечыць да пачатку вегетацыйных паліваў ачыстку і аднаўленне абвадняемай, зброснай і калектарнай сеткі і адрамантаваць гідратэхнічныя збудаванні;

б) зацвердзіць да 1 красавіка па асобных абвадняемых сістэмах дыферэнцыраваныя нормы і тэрміны паліваў сельскагаспадарчых культур з улікам глебавых умоў, агратэхнікі і ўраджайнасці. У раёнах з высокім узроўнем грунтовых вод перагледзець паліўныя і абвадняльныя нормы ў бок іх зніжэння і ажыццяўляць строгі кантроль за безумоўным выкананнем устаноўленых норм;

в) скласці і не пазней 1 красавіка 1945 года зацвердзіць планы міжраённага і міжкалгаснага водаразмеркавання ў адпаведнасці з устаноўленымі лімітамі на падачу вады; зямельным органам з удзелам органаў воднай гаспадаркі скласці і не пазней 15 красавіка 1945 г. зацвердзіць планы ўнутрыкалгаснага і соўгаснага водаскарыстання;

г) водпуск вады з капалаў рабіць па лімітах, устанаўляемых на аснове планаў водаскарыстання, зацверджаных з улікам ваданосных крыніц абваднення і меліяратыўнага стану абвадняемых зямель.

4. Абавязаць Наркамзем СССР і ЦСУ Дзяржплана СССР:

а) арганізаваць з 1945 года ўлік абвадняемых зямель і іх сельскагаспадарчага скарыстання;

б) увесці з 1945 года справаздачнасць па правядзенню паліваў і апрацоўкі абвадняемых пасеваў, ачыстцы абвадняльнай зброснай і калектарнай сеткі, рамонту сістэм і збудаванняў.

V. Па павышэнню ўраджайнасці цукровых буракоў

Лічыць адной з важнейшых задач совецкіх, партыйных і зямельных органаў буракасеючых раёнаў павышэнне ўраджайнасці цукровых буракоў і палепшанне агратэхнікі іх вырашчвання. Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі соўнаркомы рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы, ЦК компартый, крайкомы і абкомы ВКП(б) правесці наступныя мерапрыемствы:

1. Размяшчаць пасевы фабрычных цукровых буракоў, як правіла, у радыусе не больш 15 кілометраў ад цукровых заводаў і бураканарыхтоўчых пунктаў, дапускаючы, як выключэнне, павелічэнне радыуса буракасеяння да 20—25 кілометраў, не дапускаючы перагрузкі буракасеючых калгасаў пасевамі іншых прадуктаў культур.

2. Адвесці пад пасевы цукровых буракоў лепшыя незасмечаныя ўчасткі пераважна з-пад угноеных у папары азімых пасеваў. Пры гэтым пасеў цукровых буракоў правесці, як правіла, па наяўнаму зяблеваму ворыву, а ў выпадку недахвату зяблевага ворыва—па добра апрацаванаму веснавому ворыву, паднятаму на глыбіню не менш 20 см.

3. Забяспечыць своечасовы пасеў цукровых буракоў, а таксама прарыўку на працягу 10 дзён пасля шароўкі. На абвадняемых землях правесці не менш 5—7 вегетацыйных паліваў з абавязковым рыхленнем міжраддзяў пасля кожнага паліву.

4. Нарыхтаваць да веснавой сяўбы ў кожным калгасе неабходную колькасць мясцовых угнаенняў (гной, попел, курыны памёт) і вывезці іх на бураковыя ўчасткі, а таксама скарыстаць у першую чаргу пад цукровыя буракі наяўныя і завозімыя мінеральныя ўгнаенні.

VI. Аб мерах павышэння ўраджайнасці маслічных культур

У мэтах павышэння ўраджайнасці маслічных культур абавязаць соўнаркомы рэспублік, абл(край)выканкомы:

а) упарадкаваць размяшчэнне па раёнах і соўгасах пасеваў маслічных культур, не перагружаючы гэтыя раёны і калгасы іншымі працаёмкімі тэхнічнымі культурамі; размяшчаць пасевы маслічных культур па лепшых папярэдніках, як правіла, па зяблеваму ворыву, а ў выпадку недахвату зяблевага ворыва—па добра апрацаванаму веснавому ворыву;

б) забяспечыць пасеў маслічных культур у лепшыя агратэхнічныя тэрміны і правядзенне своечасовай міжрадковай апрацоўкі сланечніка, плюшчавіны і іншых прапашных маслічных культур;

в) правесці замацаванне ў брыгадах пасеваў маслічных культур за звеннямі да пачатку веснавой сяўбы, шырока прымяняючы замацаванне пасеваў маслічных культур за асобнымі членамі звяна для індывідуальнага догляду.

2. Абавязаць Наркамзем СССР:

а) аднавіць у 1945 годзе ва ўсіх вызваленых ад нямецкай акупацыі раёнах селекцыйную і насеннаводчую работу па маслічных культурах на селекцыйных і вопытных станцыях, а таксама ў райнасенгасах і забяспечыць расшырэнне вырашчвання гатункавага насення маслічных культур у селекцыйных і вопытных станцыях і райнасенгасах другіх раёнаў Саюза;

б) забяспечыць паскоранае размнажэнне і ўкараненне новых высокамаслічных гатункаў сланечніка, а таксама новых больш ураджайных гатункаў гарчыцы, ільну-кудраша і іншых маслічных культур.

3. У мэтах большай зацікаўленасці калгасаў і калгаснікаў у павелічэнні вырашчвання маслічных культур:

а) распаўсюдзіць дзеянне пункта 8 Пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 17 мая 1940 года № 804 на гарчыцу, сою, перылу, мак, арахіс і лялеманцыю, г. зн. прымаць ад калгасаў у лік выканання абавязковых паставак збожжа дзяржаве насенне гарчыцы, соі, перылы, маку, арахіса і лялеманцыі з разліку: адзін цэнтнер гарчыцы, соі, перылы, маку, арахіса і лялеманцыі за два цэнтнеры збожжа.

Пасля выканання абавязковых паставак збожжа дзяржаве выдаваць калгасам з пунктаў Заготзярно за кожны здадзены імі па абавязковых пастаўках і па кантрактацыі цэнтнер насення гарчыцы, соі, перылы, маку, арахіса і лялеманцыі два цэнтнеры збожжа;

б) распаўсюдзіць нормы выдачы масла і макухі калгасам, устаноўленыя за здачу масланасення па абавязковых пастаўках, таксама і на паступаючае ад калгасаў масланасенне ў парадку натуралаплаты МТС, пачынаючы з ураджаю 1945 года.

4. Абавязаць Наркомхарчпром СССР аднавіць на працягу 1945 года існаваўшую да вайны сетку агранамічнага абслугоўвання калгасаў па вырашчванню маслічных культур.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) лічаць, што выкананне плана развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 г. з'яўляецца важнейшай ваенна-гаспадарчай задачай совецкіх і партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў, комуністаў і комсамольцаў, аграномаў, калгаснікаў і калгасніц, рабочых і служачых у справе забеспячэння Чырвонай Армії і насельніцтва прадавольствам, а прамысловасці сыравінай.

У Соўнаркоме БССР

Соўнарком Беларускай ССР, разгледзеўшы вынікі соцыялістычнага спаборніцтва калгасаў за высокі ўраджай і аднаўленне калгаснай жывёлагадоўлі ў 1944 годзе і прызнаўшы пераможцамі ў соцыялістычным спаборніцтве, пастанавіў уручыць Пераходныя Чырвоныя сцягі Совета Народных Камісараў Беларускай ССР з выдачай першай грашовай прэміі ў суме 30 тысяч рублёў калгасу «КІМ», Хойніцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Бельскі Іосіф Емельянавіч); другой грашовай прэміі ў суме 20 тысяч рублёў калгасу «1 Мая», Гомельскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Талкачоў Іван Акімавіч) і трэцяй грашовай прэміі ў суме 10 тысяч рублёў калгасу імені Сталіна, Мехаўскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Дзяргачоў Ілья Карпавіч).

Адзначана добрая работа ў барацьбе за высокі ўраджай калгаса імені Молатава, Гомельскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Волкаў Пракофій Анісімавіч); калгаса «Авангард», Гомельскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Рабічаў Пётр Лаўрэнцьевіч); калгаса імені Сталіна, Буда-Кашалёўскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Маркаў Іосіф Мацвеевіч); калгаса «Чырвоная зара», Ельскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Копач Фёдар Антонавіч); калгаса «Праца», Хойніцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Лявіцкі Ошэр Лейбавіч); калгаса «Чырвоны сцяг», Хойніцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Аўдзеенка Васілій Раманавіч); калгаса імені Чэлюскіна, Сіроцінскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Кралько Пётр Міхайлавіч); калгаса «1 Мая», Сіроцінскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Самокін Павел Іванавіч); калгаса імені Дзержынскага, Мехаўскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Аўсоў Нікіфар Васільевіч); калгаса «Дырыжабль», Віцебскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Тамашоў С. І.); калгаса «Комінтэрн», Магілёўскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Сяргееў Ілья Васільевіч); калгаса «Маяк соцыялізма», Барысаўскага раёна, Мінскай обласці (старшыня калгаса тав. Мухін Аляксандр Ефімавіч); калгаса «Большэвік», Чэрвеньскага раёна, Мінскай обласці (старшыня калгаса тав. Кузняцоў Іван Захаравіч); калгаса «Чырвоны партызан», Смалявіцкага раёна, Мінскай обласці (старшыня калгаса тав. Сілач); калгаса «Крэмль», Чырвонапольскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Церашонак).

Па спаборніцтву за аднаўленне калгаснай жывёлагадоўлі ўручаюцца Пераходныя Чырвоныя сцягі Совета Народных Камісараў Беларускай ССР з выдачай першай грашовай прэміі ў суме 30 тысяч рублёў калгасу імені Варашылава, Церахоўскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Усаў Грыгорый Ісаевіч); другой грашовай прэміі ў суме 20 тысяч рублёў калгасу «Праўда», Мсціслаўскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Чыж Пікалай Андрэевіч).

Адзначана добрая работа па аднаўленню калгаснай жывёлагадоўлі калгаса «Залатая Дуброва», Васілевіцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Брель); калгаса імені Молатава, Васілевіцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Дзятлун Нікалай Іванавіч); калгаса «Чырвоны сцяг», Хойніцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Аўдзеенка Васілій Раманавіч); калгаса «Колас», Хойніцкага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Грынкевіч Міхаіл Ільіч); калгаса «Новы беларус», Брагінскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Дзелец Філіп Емельянавіч); калгаса імені Леніна, Брагінскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Лаваненка Пётр Еўдакімавіч); калгаса імені Тэльмана, Брагінскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Радчанка Антон Іванавіч); калгаса «Ільіч», Брагінскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Буднік); калгаса імені Калініна, Брагінскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Рабко); калгаса «Чырвоны Ельск», Ельскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Копач Іларыён Наумавіч); калгаса «Чырвоны араты», Ельскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Трашко Максім); калгаса імені Будзённага, Калінкавіцкага раёна, Палескай обласці, (старшыня калгаса тав. Голубеў Ісаак Барысавіч); калгаса імені Леніна, Нараўлянскага раёна, Палескай обласці (загадчык фермы Юшчанка Нікалай Фёдаравіч); калгаса імені «17 партз'езда», Мазырскага раёна, Палескай обласці (старшыня калгаса тав. Захарэнка Андрэй Іванавіч); калгаса «Кастрычнік», Прапойскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Батоўкін Нікіта Ермалаевіч); калгаса імені Карла Маркса, Чырвонапольскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Дубровый); калгаса «Барэц», Хоцімскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Падзерцаў); калгаса «Іскра», Шклоўскага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Белякоў Фёдар); калгаса імені Сталіна, Горацкага раёна, Магілёўскай обласці (старшыня калгаса тав. Бялясіп); калгаса імені Будзённага, Магілёўскага раёна, Магілёўскай обласці, (старшы конюх тав. Самусеў Лаўрэнцій Сцяпанавіч); калгаса імені Леніна, Церахоўскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Сацкі Фёдар Грыгор'евіч); калгаса «Чырвонаполле», Церахоўскага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Краўчанка Іван Ефімавіч); калгаса імені Дзяржынскага, Рэчыцкага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Мурашка Савелій Аркадзьевіч); калгаса «Хваля», Свяцілавіцкага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Шэвелеў Лука Міхайлавіч); калгаса «1 Мая», Уваравіцкага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Жыхараў Захар Іванавіч); калгаса «Рухавік», Уваравіцкага раёна, Гомельскай обласці (старшыня калгаса тав. Захарчанка Еўціх Філіпавіч); калгаса «Чырвоны берег», Аршанскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Хасман Міхаіл Майсеевіч); калгаса імені Крупскай, Суражскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Аляксееў Андрэй Сцяпанавіч); калгаса «Прамень Кастрычніка», Дуброўенскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Берозаў); калгаса «Герой», Талачынскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Зубараў Іван Іванавіч); калгаса «Ударнік», Сенненскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Пранько Васілій); калгаса «Перамога», Сіроцінскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Езавітаў Нікалай Нікалаевіч); калгаса «Чырвоны Гарадзец», Лепельскага раёна, Віцебскай обласці (старшыня калгаса тав. Кавалёўскі Фама Цімафеевіч); калгаса «Новы шлях», Дрысенскага раёна, Полацкай обласці (загадчык фермы тав. Быкава Юлія Іванаўна); калгаса «Праўда», Дрысенскага раёна, Полацкай обласці (загадчык фермы тав. Бялей Ігнацій Пятровіч); калгаса «1 Мая», Полацкага раёна, Полацкай обласці (загадчык фермы тав. Катушонак Яўгенія Канстанцінаўна); калгаса імені Кірава, Ветрынскага раёна, Полацкай обласці (загадчык фермы тав. Кузьміч Гаўрыл Герасімавіч); калгаса імені Дзмітрава, Ветрынскага раёна, Полацкай обласці (загадчык фермы тав. Бальшакова Лідзія Фёдараўна); калгаса імені Сталіна, Старадарожскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Дзмітрук Іван Іванавіч); калгаса «Калгаснік Беларусі», Старадарожскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Зык Фёдар Сцяпанавіч); калгаса імені Дзержынскага, Грэскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Дземарат Нікалай Іванавіч); калгаса імені Дзержынскага, Слуцкага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Махлай Сцяпан Лукіч); калгаса «1 Мая», Старобінскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Рудзеня Трафім Ефімавіч); калгаса «Завет Ільіча», Старобінскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Зікевіч Афанасій Нікалаевіч); калгаса «Звязда», Капыльскага раёна, Бабруйскай обласці (старшыня калгаса тав. Шапашнікаў Сямён Трафімавіч); калгаса імені Дзержынскага, Заслаўскага раёна, Мінскай обласці (старшыня калгаса тав. Будзінскі); калгаса «Чырвоны пуцілавец», Заслаўскага раёна, Мінскай обласці (старшыня калгаса тав. Анціповіч Васілій Васільевіч); калгаса «Чырвоная Беларусь», Барысаўскага раёна, Мінскай обласці (старшы конюх тав. Рубіс Трафім Іванавіч).

Уручэнне Чырвоных сцягаў Совета Народных Камісараў Беларускай ССР і выдача грашовых прэмій будзе праводзіцца ў адпаведнасці з пастановай Совета Народных Камісараў Беларускай ССР ад 4 мая 1944 года.

(БЕЛТА).

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 24 ЛЮТАГА

На працягу 24 лютага на ЗЕМЛАНДСКІМ поўвостраве, на паўночным захадзе ад КЕНІГСБЕРГА, нашы войскі адбівалі атакі пяхоты і танкаў праціўніка. Адначасова на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА нашы войскі вялі баі па знішчэнню ўсходне-прускай групіроўкі праціўніка і авалодалі населенымі пунктамі ЭКЕР, КУКЕНЕН, ЛАНГЕНДОРФ, КВІШЭН, ПЕРБАНДЭН, ШЭНЕБЕРГ, РАУШБАХ, АНЦІКЕН, ШВІЛГАРБЕН.

На поўдні і паўднёвым захадзе ад ДАНЦЫГА нашы войскі ў выніку наступальных баёў авалодалі населенымі пунктамі ЖЭРАНЖКО, МАКСХАУЗЕН, ВЕЛЬБРАНДОВО, ОСОВО, ЗАМОСЦ, КЛОДНЯ, ГРОС-ІЕНЦНІК, МОСІН, ШТАЙНБОРН, ШТРЭТЦЫН. У горадзе ГРУДЗЯНДЗ (ГРАУДЭНЦ) прадаўжаліся баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка.

У раёне БРЭСЛАУ нашы войскі, прадаўжаючы баі па знішчэнню акружанай у горадзе групіроўкі праціўніка, авалодалі прыгарадам ОЛЬТАШЫН і занялі 15 кварталаў у паўднёвай частцы горада.

На паўночным беразе ДУНАЯ, на ўсходзе ад КАМОРНО, нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 23 лютага на ўсіх франтах падбіта і знішчана 116 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 34 самалёты праціўніка.

* * *

На паўднёвым захадзе ад Кенігсберга нашы войскі прадаўжалі баі па ліквідацыі ўсходне-прускай групіроўкі немцаў. Часці Н-скага злучэння зламалі супраціўленне праціўніка і поўнасцю ачысцілі шасе Ліхтэнфельд — Цынтэн. Другія нашы часці, якія наступаюць з поўдня на поўнач, выбілі немцаў з раду апорных пунктаў. Совецкія танкісты і пехацінцы, якія наносяць удары з захада на ўсход, захапілі некалькі дзесяткаў жалезабетонных дотаў і вядуць баі за перакрыжаванне шасейных дарог у 8 кілометрах на паўднёвым усходзе ад горада Браунсберг. У ходзе баёў за дзень знішчана звыш 2.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплены трафеі і палонныя.

У баях ва Усходняй Прусіі адважна дзейнічаюць совецкія танкісты. Танкавая рота капітана Сімуткіна ў кароткай схватцы падбіла тры нямецкіх танкі, гармату, 12 аўтамашын і захапіла 8 спраўных танкаў «Пантэра». На другім участку агонь з нямецкага дота перагарадзіў шлях нашай пяхоце. Танк лейтэнанта Падачына агнём з гарматы разбіў дзверы дота. 8 гітлераўцаў, якія асталіся ў жывых, здаліся ў палон. Танкі малодшых лейтэнантаў Буянава і Дземідава ўварваліся ў населены пункт, знішчылі звыш роты гітлераўцаў і захапілі 6 спраўных гармат.

* * *

На поўдні ад горада Данцыг немцы падцягнулі свежыя сілы і прабавалі контратакаваць нашы наступаючыя часці. Нашы войскі, якія дзейнічаюць уздоўж заходнага берага ракі Віслы, адбілі ворожыя контратакі і, прасоўваючыся ўперад, выбілі немцаў з некалькіх населеных пунктаў. Другія нашы часці авалодалі вузлом шасейных дарог Мосін. На адным участку праціўнік кінуў у контратакі танкі. Сустрэтыя агнём совецкай артылерыі немцы страцілі 17 танкаў і былі адкінуты.

У горадзе Грудзяндз (Граудэнц) нашы войскі прадаўжалі весці баі па ліквідацыі акружанага гарнізона праціўніка. Совецкая артылерыя і авіяцыя магутным агнём і бомбавымі ўдарамі разбуралі крэпасць, форты і доты. Варожы гарнізон нясе велізарныя страты і пад ударамі совецкіх часцей траціць адну пазіцыю за другой. Ноччу да батальёна нямецкай пяхоты з састава акружанага гарнізона пераправіліся праз Віслу і прабавалі сысці ў лясах. Гітлераўцы трапілі ў агнявы мяшок і ў большай сваёй частцы былі знішчаны.

* * *

У Брэслаў нашы войскі прадаўжалі сціскаць кальцо акружэння групіроўкі праціўніка. Совецкія часці, якія ўварваліся ў горад з поўдня, настойліва прасоўваюцца ўперад, падаўляючы варожыя вузлы супраціўлення. У выніку артылерыйскага абстрэлу і атакі, якая затым паследвала, немцы выбіты з казарм. Занята таксама воданапорная вежа, ператвораная ў вельмі ўмацаваны апорны пункт абароны. Совецкія артылерысты, расчышчаючы шлях пяхоце, агнём прамой наводкі знішчаюць кулямёты і гарматы праціўніка, устаноўленыя ў падвалах і на чардаках дамоў. На другім участку нашы байцы авалодалі прыгарадам Ольташын і занялі чыгуначную станцыю. Захоплена многа трафеяў. Знішчана 22 танкі і 12 бронетранспарцёраў праціўніка.

* * *

Караблямі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота ў ноч на 24 лютага ў паўднёвай частцы Балтыйскага мора патоплены два нямецкія транспарты і вартавы карабель праціўніка.

* * *

З велізарным уздымам сустрэлі совецкія байцы, сяржанты, афіцэры і генералы загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Чырвонай Арміі. На фронце, у прыфрантавых і тылавых гарнізонах, у многіх часцях і падраздзяленнях адбыліся масавыя мітынгі і сходы. Прамовы выступаўшых на мітынгах прасякнуты гарачай любоўю і бязмежнай адданасцю таварышу Сталіну, нашай магутнай Радзіме. Совецкія воіны непахісны ў сваёй рашымасці разам з арміямі нашых саюзнікаў давяршыць справу разгрому нямецка-фашысцкай арміі, заваяваць псўную і канчатковую перамогу.

На 1-м Беларускім фронце, у часці, дзе камандзірам маёр Белоў, на мітынгу выступіў гвардыі маёр Лобачэў. «Чырвоная Армія, — сказаў ён, — прайшла слаўны баявы шлях. Сваю 27-ю гадавіну яна адзначае на тэрыторыі Германіі. Нам прадстаяць яшчэ цяжкія баі. Адчуваючы сваю неміну чую гібель, праціўнік ярасна супраціўляецца. Ён прыбягае і будзе прыбягаць да самых каварных сродкаў барацьбы. Але яму не спыніць нашы палкі, не пазбегнуць гібелі. Змятаючы на сваім шляху ўсе і ўсякія перашкоды, мы дойдзем да Берліна і ўзнімем над ім наш пераможны сцяг».

На 3-м Беларускім фронце на мітынгу ў Н-скай часці з прамовай выступіў чырвонаармеец Іваноў. Ён сказаў: «Гітлераўскія звяры лютавалі на нашай зямлі. Яны разбурылі маю вёску, спалілі маю сям'ю. Чырвоная Армія ачысціла свяшчэнную совецкую зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўторглася на тэрыторыю Германіі. Мы навекі адаб'ем у немцаў ахвоту рабаваць мірныя народы і здзекавацца над імі».

Святкаванне дня Чырвонай Арміі за граніцай

НЬЮ-ЙОРК, 24 лютага. (ТАСС). Па ініцыятыве «Камітэта па аказанню дапамогі СССР у вайне» быў арганізаван вечар, прысвечаны 27-й гадавіне Чырвонай Арміі. На вечары прысутнічала больш 2.500 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі амерыканскіх, англійскіх і французскіх узброеных сіл.

* * *

БЕЛГРАД, 24 лютага. (ТАСС). 21 лютага ў Белградзе адбыліся ўрачыстыя вечары, прысвечаныя 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

* * *

ВАРШАВА, 23 лютага. (ТАСС). 22 лютага ў зале паседжання Варшаўскай Рады Нарадовай адбыўся ўрачысты сход грамадскасці Варшавы, прысвечаны 27-й гадавіне Чырвонай Арміі. Звыш 1.000 грамадскіх і культурных дзеячоў Варшавы, рабочых, служачых, інтэлігенцыі, членаў дэмакратычных партый сабралося тут, каб адзначыць слаўную гадавіну арміі-вызваліцельніцы.

* * *

БЕЙРУТ, 24 лютага. (ТАСС). З прычыны 27-й гадавіны Чырвонай Арміі таварыства прыяцеляў Совецкага Саюза ў Ліване арганізавала ў Бейруце выстаўку, прысвечаную СССР. Выстаўку адкрыў старшыня совета міністраў Лівана.

25-годдзе ГОЭЛРО

Гутарка з народным камісарам электрастанцый СССР тав. Д. Г. Жымерыным

25 год назад па ініцыятыве Леніна і Сталіна была ўтворана камісія па электрыфікацыі Расіі—ГОЭЛРО. Гэтай камісіі, да работы якой было прыцягнута да 200 выдатных спецыялістаў, было даручана распрацаваць план электрыфікацыі краіны.

Ленін і Сталін надавалі выключна вялікае значэнне электрыфікацыі. Владзімір Ільіч лічыў план ГОЭЛРО «Другой праграмай партыі».

План ГОЭЛРО прадугледжваў не толькі будаўніцтва буйных электрастанцый, але і ўказваў асноўныя шляхі ўздыму і развіцця ўсёй народнай гаспадаркі краіны. Вось чаму таварыш Сталін лічыў, што план ГОЭЛРО—гэта майстэрскі набросак сапраўды адзінага і сапраўды дзяржаўнага гаспадарчага плана.

План ГОЭЛРО быў разлічан на 10—15 год. Ён прадугледжваў перавышэнне амаль у два разы ўзроўню прамысловага развіцця краіны ў параўнанні з 1913 годам. У ім асабліва падрабязна была распрацавана энергетычная праграма. У аснову плана было прынята будаўніцтва магутных раённых электрастанцый са скарыстаннем мясцовых рэсурсаў энергіі і асабліва нізкагатункова паліва (торфу, нізкакаларыйных вугаляў, розных адыходаў) і воднай энергіі рэк, стварэнне адзінай электрагаспадаркі ў асобных эканамічных раёнах краіны, міжраённае злучэнне (кальцаванне) электрастанцый, будаўніцтва высокавольтных ліній электрапередачы, электрыфікацыя чыгуначнага транспарта і іншае.

22 снежня 1920 года план ГОЭЛРО быў адобран VIII Усерасійскім з'ездам советаў.

Совецкі народ пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна самааддана ўзяўся за ажыццяўленне плана электрыфікацыі і да намечанага тэрміну перавыканаў яго амаль у тры разы. Былі збудаваны Волхаўская гідраэлектрастанцыя, Кашырская, Шатурская, Свірская, Горкаўская электрастанцыі, Днепрагэс імені Леніна і іншыя. Кожнаму цяпер зразумела, што праграма развіцця прамысловасці на базе электрыфікацыі з'явілася адной з умоў паспяховай барацьбы з фашысцкай Германіяй.

Напярэдадні Айчыннай вайны СССР па вырабу электрычнай энергіі заняў другое месца ў Еўропе і трэцяе месца ў свеце, апярэдзіўшы Англію, Францыю, Японію. У 1913 годзе Расія ў вырабе энергіі займала апошняе месца, уступаючы нават такім краінам, як Швейцарыя.

У перыяд Айчыннай вайны совецкая энергетыка падверглася сур'ёзным выпрабаванням. Нямецка-фашысцкія захопнікі з асаблівым шаленствам разбуралі энергагаспадарку акупіраваных імі раёнаў. Многія энергетычныя аб'екты былі знішчаны і разграблены гітлераўскімі бандамі.

Калі пачалося пабеданоснае наступленне Чырвонай Арміі, разам з перадавымі часцямі ў вызваленыя гарады ўступілі і совецкія энергетыкі, каб аднаўляць разбураныя электрастанцыі. Ужо адноўлены і ўвайшлі ў строй дзеючых 35 раённых электрастанцый. У ходзе работ совецкія энергетыкі праявілі вялікую самаадданасць, многа ініцыятывы і тэхнічнай смякалкі.

Не гледзячы на цяжкасці ваеннага часу, у краіне прадаўжалася будаўніцтва новых электрастанцый на Урале, на Поўначы, у Сярэдняй Азіі, у Сібіры і другіх раёнах краіны. За гады вайны энергетычныя рэсурсы краіны значна ўзраслі.

Работнікі совецкіх электрастанцый і электрасетак дасягнулі нямалых поспехаў у эксплаатацыі абсталявання, укараненні новай тэхнікі, палепшанні тэхніка-эканамічных паказчыкаў і зніжэнні аварыйнасці. У 1944 годзе было выраблена электраэнергіі на 23,4 процанта, а цеплаэнергіі на 25,1 процанта больш, чым у 1943 годзе. Скарыстанне гідраэлектрастанцый рэзка ўзрасло—з 3.848 гадзін у 1940 годзе да 5.232 гадзін у 1944 годзе.

Пры правядзенні капітальных рамонтаў павелічэнне парапрадукцыйнасці катлоў толькі ў 1944 годзе дало прырост рабочай магутнасці электрастанцый на 108 тысяч кіловат. Станцыі знізілі ўдзельныя выдаткі ўмоўнага паліва на 1 кіловатгадзіну з 594 грамаў у 1940 годзе да 572 грамаў за 1944 год, што з'яўляецца буйным дасягненнем совецкіх энергетыкаў.

Партыя, урад, асабіста таварыш Сталін аддаюць велізарную ўвагу развіццю энергетыкі, далейшай электрыфікацыі краіны. У 1945 і 1946 годах намечана закончыць аднаўленне разбураных ворагам электрастанцый і выканаць вялікую праграму будаўніцтва новых магутных цеплавых і гідраўлічных станцый.

Дзень 25-годдзя ўтварэння камісіі ГОЭЛРО Совецкі Саюз сустрэў у абстаноўцы вялікіх перамог Чырвонай Арміі. Энергетыкі разам з усім народам прыкладаюць усе сілы да таго, каб даць краіне і фронту больш электраэнергіі, забяспечыць далейшае, яшчэ больш магутнае развіццё электрыфікацыі краіны.

(ТАСС).

На мінскім кафельным заводзе 17-гадовы майстар-ганчар І. А. Шаблоўскі ўручную выконвае норму на 150—180 процантаў.

На здымку: майстар-ганчар І. А. Шаблоўскі і яго вучань Н. З. Пітухоўскі за работай.

Фото А. КАРНІЦКАГА.

Разгарнуць будаўніцтва глінабітных дамоў

Гутарка з намеснікам наркома мясцовай прамысловасці БССР тав. СПІРЫДОНАВЫМ

Совецкая Беларусь у нетрах зямлі мае велізарныя залежы рознагатункових глін і гліназёмаў. Каштоўнае гэтае багацце не поўнасцю скарыстоўваецца. Між тым, гліны і гліназёмы могуць быць шырока прымянёны для будаўніцтва дамоў і розных калгасных памяшканняў.

Нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі і спалілі тысячы беларускіх вёсак, сотні мястэчак і гарадоў. Цяпер ідзе напружаная праца па адбудове жыллёвай гаспадаркі рэспублікі. Аднаўленне гэтай гаспадаркі патрабуе велізарнай колькасці лясных матэрыялаў, транспарта, вялікага напружання сіл. Ва ўмовах нашай рэспублікі лясныя матэрыялы можна замяніць больш таннымі і не менш практычнымі — глінамі і гліназёмамі.

Вопыт будаўніцтва глінабітных памяшканняў на Украіне, у Сярэдняй Азіі і ў Запаляр'і паказвае, што яно не патрабуе асабліва вялікай затраты сіл, што матэрыялы гэтыя вельмі ўстойлівыя. Хто бываў на Украіне, той ведае, якія ўтульныя, прыгожыя, цёплыя і светлыя глінабітныя дамы будуюцца ў вёсках гэтай рэспублікі.

Мы можам і павінны шырока перанесці гэты вопыт у нашу рэспубліку. Разгортванне глінабітнага будаўніцтва дасць нам магчымасць у хутчэйшы час з мясцовай сыравіны без затраты транспартных сродкаў і дрэвараспіловачных матэрыялаў атрымаць вялікія жылыя плошчы.

Глінабітныя памяшканні можна будаваць не толькі аднапавярховыя, а і шматпавярховыя з прымяненнем каркаса. У нашых умовах можна будаваць розныя вялікія калгасныя пабудовы.

Спосаб нарыхтоўкі матэрыялаў для глінабітных пабудоў, блокаў і цэглы вельмі просты і не патрабуе вялікіх затрат. Неабходна ў кожнай вёсцы стварыць невялікія цагельні, якія-б выраблялі сырэц, разгарнуць выраб цэглы ручным метадам. Пры вырабе цэглы з гліны трэба дадаваць не толькі пясок, а і мох, салому, верас, кастрыцу, торф. Гэта робіць цэглу лёгкай, яшчэ больш трывалай.

Будаўніцтва глінабітных памяшканняў лепш праводзіць у летні час, калі яны могуць добра прасохнуць, а вясной, восенню і зімой рэкамендуецца будаўніцтва з блокаў і цэглы. Будаваць дамы неабходна на трывалых фундаментах, дахі павінны быць гліна-саламяныя, што стварае агнеўстойлівасць памяшкання.

З наступленнем вясны кожны раён, кожны сельскі совет павінен разгарнуць нарыхтоўку гліны і цэглы для хутчэйшай адбудовы вёсак, для пабудовы калгасных памяшканняў.

„ТАК І БУДЗЕ"

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). Другі Беларускі драматычны тэатр імені Якуба Коласа адзначыў дзень слаўнай гадавіны Чырвонай Арміі новай пастаноўкай п'есы К. Сіманава «Так і будзе». Пастаноўка галоўнага рэжысёра тэатра тав. Лойтэра, мастак тав. Нікалаеў.

«Так і будзе»—першы спектакль, які створан калектывам тэатра пасля звароту ў родны горад. Гэты спектакль з'яўляецца вялікай падзеяй у жыцці тэатра і дастойным падарункам у чэсць 27-й гадавіны Чырвонай Арміі.

У галоўных ролях лепшыя сілы тэатра: народныя артысты БССР—Малчанаў, Звездачотаў, заслужаная артыстка БССР Жылінская, артысты Чэрэнічэнка, Маркоўская, Шмакаў і другія. Адначасова тэатр рыхтуе да пастаноўкі п'есу Н. Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты».

СЯЛЯНАМ ВЕРНУТА ІХ ЗЯМЛЯ

ВАЛКАВЫСК, 24 лютага. (БЕЛТА). Нямецка-фашысцкія захопнікі, акупіраваўшы тэрыторыю Валкавыскага раёна, адабралі ў сялян зямлю.

Зараз уся адабраная ў сялян зямля вернута ім зноў. 454 беззямельных і малазямельных гаспадаркі атрымалі 1.368 гектараў зямлі.

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Цэнтрэсіўны друк усяго свету аддае вялікую ўвагу 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

Гістарычныя дасягненні совецкіх войск і рашаючая роля, якую яны адыгрываюць у разгроме гітлераўскай Германіі, прызнаюцца ўсюды. Многія журналісты і відныя дзеячы за граніцай адзначаюць ганебны правал злосных прароцтваў некаторых рэакцыянераў, якія заяўлялі ў дні часовых поспехаў немцаў аб тым, што «германская армія пройдзе скрозь Чырвоную Армію таксама, як нож праходзіць скрозь масла». Цяпер, калі Чырвоная Армія выгнала гітлераўцаў разбойнікаў за межы совецкай зямлі, разбіла рад магутных абарончых сістэм праціўніка, разграміла ў шматлікіх «катлах» адборныя германскія дывізіі і перанесла ваенныя дзеянні на тэрыторыю Германіі, ніхто не сумняваецца ў перавазе магутнасці, баявой тэхнікі і маральнага духу ў перавазе стратэгіі і тактыкі Чырвонай Арміі.

«Толькі ў казцы могуць быць зроблены цуды накшталт тых, што былі зроблены камандаваннем і салдатамі Чырвонай Арміі, якія зламалі супраціўленне ворага і праніклі далёка ў глыб яго тэрыторыі», адзначае французскае радыё ў сваёй перадачы з Браззавіля. Характарызуючы магутнае наступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыі Германіі, газета «Стокгольмс тыднінген» пісала 21 лютага: «Расія і яе арміі, якія наступаюць у Германіі, падобны гіганту, што ідзе сямімільнымі крокамі. Гэта сапраўды пераканаўчая і яркая карціна...».

«У вялікіх бітвах Айчыннай вайны супроць нямецкага нашэства Чырвоная Армія выратавала народы Совецкага Саюза ад нямецка-фашысцкага рабства, адстаяла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы і дапамагла народам Еўропы скінуць нямецкае ярмо» (Сталін). Зусім натуральна, што журналісты, ваенныя наглядальнікі і дзяржаўныя дзеячы за граніцай імкнуцца ўскрыць прычыны такіх бліскучых перамог Чырвонай Арміі. Найбольш назіральныя і дальнавідныя людзі правільна звязваюць бяссмертныя подвігі Чырвонай Арміі на палях сражэнняў з новым грамадскім ладам, узнікшым у нас у выніку Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Парыжскае радыё ў аглядзе Жана Руга перадавала 21 лютага: «У гэтай вячнай краіне нічога не прадпрымаецца і нічога не існуе па-за народам і без народа. Армія і народ, зліўшыся ў адно, змагаюцца з ворагам. Совецкія людзі сталі героямі, бо яны ведаюць, што яны абараняюць новы свет».

Пават вораг вынужан прызнаць высокае майстэрства совецкага камандавання і высокія баявыя якасці совецкага байца. Нямецкі радыёаглядальнік генерал-лейтэнант Дытмар у сваім аглядзе ад 13 лютага перасцерагаў супроць «недаацэнкі майстэрства камандавання і боездольнасці Совецтаў...». «Стойкасць, упорства і пагарда да смерці кожнага асобнага чырвонаармейца—вядомы, заяўляў ён. Гэта—тыпова рускія якасці». Справа, зразумела, не толькі ў традыцыйнай храбрасці, стойкасці і выносліваści рускага салдата, праслаўленага ў вяках,—справа ў тым гістарычным працэсе сацыялістычнай перабудовы нашай краіны, які наклаў свой адбітак на ўсю нашу эканоміку, на ўсё аблічча нашага жыцця, на ўнутраны свет совецкіх людзей, ведаючых, што ў гэтай вайне супроць гітлераўскіх варвараў яны абараняюць сваю сацыялістычную айчыну, свае заводы, фабрыкі і калгасы, сваю сацыялістычную совецкую культуру. Іменна гэтая акалічнасць у сто разоў памножыла і памнажае сілы Чырвонай Арміі і совецкага тыла.

* * *

Замежны друк прадаўжае ажыўлена каментыраваць гістарычныя рашэнні Крымскай канферэнцыі.

Друк саюзных краін асабліва падкрэслівае пры гэтым наступныя моманты: па-першае, рашэнні, прынятыя ў Крыму, азначаюць наяўнасць поўнай дагаворанасці паміж саюзнікамі аб магутных каардынаваных ударах па Германіі ў заключнай фазе вайны. Гэта кладзе канец усякім інсінуацыям падгалоскаў Гебельса аб тым, што нібыта паміж камандаваннем Чырвонай Арміі і камандаваннем саюзнікаў існуюць рознагалоссі, якія перашкаджаюць узгодненым дзеянням супроць Германіі. Такога рода чуткі распаўсюджвалі напярэдадні Крымскай канферэнцыі аглядальнікі тыпу Брауна і Балдуіна. Па-другое, рашэнні Крымскай канферэнцыі азначаюць поўны правал надзей гітлераўскай Германіі на ўзнікненне рознагалоссяў у лагеры саюзнікаў. Замежны друк адзначае, што Сталін, Рузвельт і Чэрчыль здолелі плённа вырашыць у Крыму такія складаныя пытанні, як польскае, югаслаўскае, як праблему вызваленай Еўропы і другія. Рашэнні Крымскай канферэнцыі прадэманстравалі ўсяму свету наяўнасць адзінадушша паміж саюзнікамі не толькі па пытаннях вядзення вайны, але і па асноўных пытаннях пасляваеннага ўпарадкавання свету, у тым ліку па такіх пытаннях, як дэмакратычнае ўпарадкаванне краін вызваленай Еўропы, акупаныя Германіі, пакрыцё страт, нанесеных яе арміямі народам Еўропы, арганізацыя міжнароднай бяспекі і г. д. Па-трэцяе, рашэнні Крымскай канферэнцыі, па думцы раду аглядальнікаў, азначаюць перамогу прынцыпа калектыўнай бяспекі, ажыццяўляемай пад кіраўніцтвам трох вялікіх дзяржаў.

Сусветная грамадскасць вітае рашэнні Крымскай канферэнцыі, бо яны прадвяшчаюць хуткі разгром гітлераўскай Германіі і стварэнне такога парадку ў свеце, які папярэдзіць узнікненне новай германскай агрэсіі. Не дзіўна, што германскі друк сустрэў гэтыя рашэнні шалёным выццём. Польскія рэакцыянеры з лагера эміграцыйнага «ўрада» ў Лондане таксама заявілі аб сваёй нязгодзе з рашэннямі канферэнцыі. У той час, як польскі народ, які змагаецца разам з Чырвонай Арміяй за сваю свабоду, вітае мерапрыемствы, намечаныя ў Крыму, прыхільнікі Арцішэўскага, Кавальскага і другіх як у Лондане, так і ў ЗША падымаюць зараз кампанію супроць гэтых рашэнняў. Тым самым яны дапамагаюць гітлераўскай прапагандзе.

Аднак сусветная грамадскасць становіцца ўсё больш яскравым, што польскія рэакцыянеры поўнасцю адарваліся ад свайго народа, не выказваюць яго думку. Як адзначала амерыканская газета «Рэджыстэр», «нязначная група лондонскіх палякаў не можа быць карыснай для эфектыўнага вырашэння польскай праблемы».

* * *

Ваенныя дзеянні на Піхім акіяне набываюць усё большы размах, пашыраючыся на тэрыторыі, якія асталіся да гэтага часу па-за радыусам дзеянняў англа-амерыканскага флота. Моцныя амерыканскія эскадры, у тым ліку авіяносны і лінкоры, 16 лютага наблізіліся да берагоў уласна Японіі. Амерыканскія бамбардыроўшчыкі атакавалі сталіцу Японіі—Токіо і рад прамысловых цэнтраў на японскіх астравах. 19 лютага часці 5-га корпуса амерыканскай марской пяхоты высадзіліся на востраве Іва-дзіма, які знаходзіцца, прыкладна, на поўшляху паміж востравам Гуам і Токіо, і стварылі там прадмосныя ўмацаванні. Перад высадкай быў праведзен трохдзённы абстрэл вострава з караблёў амерыканскага флота. Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд прэс, які знаходзіцца пры штабе Ціхаакіянскага флота, у аперацыях прымала ўдзел звыш 800 караблёў. Японскі гарнізон на в. Іва-дзіма, колькасцю каля 15.000 чалавек, аказвае ўпорнае супраціўленне. Аднак амерыканскія войскі ўсё больш прасоўваюцца ў глыбіню вострава, імкнучыся захапіць наяўныя на ім аэрадромы.

Японскі друк з трывогай адзначае, што ўзброеныя сілы праціўніка маюць намер нанесці з новых плацдармаў новыя, яшчэ больш магутныя ўдары па ўласна Японіі.

Г. БЕСПАЛАЎ.

РАШЭННЕ ТУРЭЦКАГА ЎРАДА

АНКАРА, 23 лютага. (ТАСС). Як перадае анкарскае радыё, сёння турэцкі меджліс зацвердзіў рашэнне турэцкага ўрада аб аб'яўленні вайны Германіі і Японіі.

Матывіруючы ў сваім выступленні ў меджлісе гэтае рашэнне ўрада, міністр замежных спраў Хасан Сака заявіў, што для таго, каб атрымаць магчымасць удзельнічаць у прадстаячай 25 красавіка ў Сан-Францыско канферэнцыі, Турцыя павінна да 1 сакавіка гэтага года аб'явіць вайну дзяржавам асі.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

27 лютага, у 19 гадзін, у Доме партасветы адбудзецца публічная лекцыя — «Ваенна-палітычнае і міжнароднае становішча Совецкага Саюза».

Лекцыю чытае тав. Пазняк.

Білеты можна атрымаць у райкомах КП(б)Б і ў Доме партасветы.

ДОМ ПАРТАСВЕТЫ.

Павялічым насенныя рэсурсы бульбы

ВЫРАШЧВАННЕ БУЛЬБЫ ПАРАСТКАМІ

Барацьбу за атрыманне высокіх і ўстойлівых ураджаяў неабходна пачынаць зімой. Гэтае правіла асабліва адносіцца да бульбы.

Як вядома, у сваім саставе бульба мае больш 75 процантаў вады. З гэтай прычыны пры няправільным хаванні яна падпадае розным гніенням і часам гніе палавіна і больш ураджаю. Таму цяпер патрэбна ўстанавіць пільнае назіранне за хаваннем насеннай бульбы. Тэмпература ў сховішчах і буртах не павінна быць вышэй 2—3 градусаў. Калі тэмпература дасягае вышэй 8 градусаў, бульба пачынае гніснці. У такіх выпадках у сховішчах патрэбна ліквідаваць ачаг загніўшай бульбы, а бурты, у якіх устаноўлена гніенне, у часе аблігі адкрываюцца і бульба перавозіцца ў сховішча, а там перабіраецца. Адкрываць бурт трэба толькі тады, калі тэмпература паветра не ніжэй мінус 5 градусаў.

Ад правільнага хавання бульбы залежыць атрыманне высокага яе ўраджаю. Калі насенная бульба пры хаванні мела высокі процант гніляў, то і ў атрыманым ад яе ўраджаі будзе высокі процант хвароб, а значыць і ўраджай будзе ніжэй звычайнага на 20 і больш процантаў. Таму ў калгасах ужо цяпер павінен быць устаноўлен пільны нагляд за насеннай бульбай.

Клапоцячыся аб насеннай бульбе, трэба разам з гэтым дапамагчы калгаснікам асвоіць новыя метады пасадкі бульбы, якія высунуты ў перыяд Айчыннай вайны, у прыватнасці, метад пасадкі бульбы вярхушкамі і парасткамі. У гэтым артыкуле мы больш падрабязна спынімся на пасадцы бульбы парасткамі. Гэты метад распачала запісан у брашуры прафесара Дуніна. Як паказвае сама назва, тут мы бульбу садзім не цэлымі клубнямі, а парасткамі, вырашчанымі з клубняў або іх частак.

Вопыт калгасаў і соўгасаў Ленінградскай абласці, а таксама трохгадовы вопыт калгасаў Калінінскай абласці паказвае аб вялікім значэнні гэтага метаду. Ён асабліва прымянім ва ўмовах нашай рэспублікі, у тых калгасах і соўгасах, дзе адчуваецца недахоп насеннай бульбы.

Гэты метад важны і таму, што за час «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі асталося вельмі мала чыстагатунковай бульбы. А перад намі стаіць задача на працягу 1—2 год стварыць чыстагатунковы фонд насеннай бульбы, у асаблівасці ракаўстойлівых гатункаў. Паспяхова вырашыць гэтую задачу ў многім дапаможа метад пасадкі бульбы парасткамі, таму што гэты метад дае ўраджай не сам 8—12, як пры пасадцы клубнямі, а сам 80—100 і больш.

У нашай рэспубліцы бульба асабліва перпіць ад такой хваробы, як фітафтора. Гэты грыбок часта зніжае ўраджай да 50 процантаў і больш. Парасткавая бульба пазбаўлена гэтай хваробы, таму што яна паспявае раней, чым паяўляецца гэты грыбок на бульбоўніку. Згодна вопытаў прафесара Дуніна, бульба накапляе ўраджай у 200 цэнтнераў з гектара і больш да паяўлення фітафторы.

У многіх калгасах Калінінскай, Растоўскай і Ленінградскай абласцей пры пасадцы бульбы парасткамі за лета атрымалі двухразовыя ўраджаі. Такім чынам, мы бачым, што пасадка бульбы парасткамі ў нашай рэспубліцы набывае вялікае дзяржаўнае значэнне, і асабліва яна павінна быць пашырана на сядзібах рабочых і служачых.

Коратка спынімся на некаторых правілах вырашчвання бульбы парасткамі. Участак для пасадкі, як і для пасадкі клубнямі, трэба з восені ўгноіць і ўзараць на зіму. Парасткі для пасадкі рэкамендуецца вырашчваць на градах. На кожны гектар палявой глебы пры пасадцы парасткамі рэкамендуецца 3—5 цэнтнераў клубняў, пры звычайнай-жа пасадцы 15—18 цэнтнераў, гэта значыць змяншэнне пасадачнага матэрыялу ў пяць разоў. Гэтая колькасць клубняў размяшчаецца на градах агульнай плошчай у 30—70 квадратных метраў.

Для зручнасці работы мэтазгодна будаваць скрыні, якія павінны быць каля 70 сантыметраў шырынёй і 15—20 метраў даўжынёй. Грады трэба рабіць на паўднёвых схілах або на роўным, узвышаным, незатапляемым месцы. Пры вырашчванні ранніх парасткаў грады павінны быць абавязкова абаронены ад халодных паўночных, а па магчымасці ад паўночна-ўсходніх і паўночна-заходніх вятроў будынкамі, высокім плотам або густымі насаджэннямі дрэў ці зараснікаў. Для таго, каб шчыты або маты пасля іх вертыкальнай устаноўкі днём не зацянялі наглыбленых і поўнаглыбленых град, адлегласць паміж імі павінна быць два метры.

Што датычыць адкрытых градак, то іх трэба размяшчаць блізка адна ад другой, паколькі тут не прымяняюць ні шчытоў, ні матаў. Паглыбленыя грады прызначаюцца для вырашчвання самай ранняй парасткавай бульбы. Шырыня такіх канаў-катлаванаў робіцца ў 70 сантыметраў, глыбіня ў грунце — каля 40 сантыметраў. Грунт выкідаюць галоўным чынам па паўночны бок канавы. Там, дзе ёсць нескарыстаныя парніковыя катлаваны, іх трэба прыстасоўваць для ўцепленых град, захоўваючы звычайную шырыню парнікоў. Вясной праводзяць набіўку ўцепленых градак гноем. Пасадка бульбы на паглыбленых градах праводзіцца за 10—20 дзён да звычайных сярэдне-ранніх тэрмінаў пасадкі бульбы ў полі, гэта значыць у нашых умовах 15—20 красавіка. Поўнаглыбленыя грады могуць у поўнай меры замяняць паглыбленыя, розніца заключаецца толькі ў тым, што мы атрымліваем на 5—10 дзён пазней парасткавы матэрыял.

На месцах, намечаных для поўнаглыбленых град, праводзяць аднаямешным плугам раз'ёмную баразну, глыбінёй у 20—25 сантыметраў, і рыдлёўкай падчышчаюць зямлю, якая насыпалася ў баразну. Такую баразну-канаву можна выкапаць і рыдлёўкай, выняўшы грунт на адзін поўны штых. У баразну або канаву ўносяць і няшчыльна размяшчаюць гарачы гной, а таксама гарачае гаспадарчае смецце. Гной або смецце кладуць так, каб яно запоўніла ўсю канаву і ўзвышалася над краямі галоўнага грунту на 8—10 сантыметраў. Пасля гэтага глебу, галоўным чынам верхнюю частку ворыўнага пласта, з краёў баразны перакідаюць на паверхню гною. Гэтай-жа глебай гной прыкрываюць з боку пластам у 8—10 сантыметраў.

Яшчэ прасцей вырашчваць парасткавую бульбу на бязгнойных уцепленых градах. Для гэтага на паверхню град насыпаюць і дасканала раўняюць граблямі перагной або праветраны торф пластам у 3—4 сантыметры. Перагной і торф паглынаюць значна больш сонечных праменняў, чым звычайная глеба, і таму садзейнічаюць больш хуткаму і моцнаму прагреванню грады яшчэ да высадкі клубняў. Пасадку-ж клубняў на бязгнойныя ўцепленыя грады трэба праводзіць за 5—10 дзён да звычайных пасадак.

Самым адказным момантам з'яўляецца падбор пасадачнага матэрыялу для вырашчвання парасткаў. Для гэтага можна скарыстоўваць цэлыя клубні, а таксама добраякасныя, не гнілыя і не вялыя вярхушкі, зрэзаныя з харчовых клубняў. Можна скарыстоўваць ценявыя або склепавыя парасткі, якія звычайна вырастаюць вясной з клубняў у цёплых і цёмных памяшканнях. Для індывідуальных гародаў можна скарыстаць спецыяльна вырезаныя з клубняў вочкі з невялікай колькасцю мякаці, а таксама ачысткі з вочкамі. Безумоўна, лепшым матэрыялам трэба лічыць клубні сярэдняга размеру—з курынае яйка і больш. Адабраную здаровую бульбу трэба пакласці па спелажы ці рассыпаць па падлозе пластам у 1—2 клубні ў светлым і цёплым памяшканні пры тэмпературы ў 14—18 градусаў. Пры гэтых умовах бульба павінна знаходзіцца на прагну 4—6 тыдняў, а потым перасаджваецца ў градкі.

Пасадку парасткаў робяць пасля таго, як пройдуць вясенняя замаразкі. На невялікіх участках пасадку можна рабіць пад рыдлёўку, як садзяць, напрыклад, капусную ці таматную расаду. На вялікіх участках пасадка робіцца пад плуг ці акучнік. Пры пасадцы абавязкова трэба праводзіць адборку хворых і загніўшых парасткаў і клубняў. Усю работу па выбарцы і пасадцы парасткаў трэба арганізоўваць так, каб парасткі па магчымасці неадкладна пасля іх выбаркі высаджваліся на раней падрыхтаваныя ўчасткі.

Такія ў агульных рысах некаторыя моманты з агратэхнікі вырашчвання бульбы парасткамі. Гэтаму метаду вырашчвання бульбы трэба аддаць належную ўвагу як у калгасах (асабліва пры размнажэнні каштоўнага чыстагатунковага матэрыялу), так і на індывідуальных гародах рабочых і служачых.

Прафесар Н. ДАРОЖКІН.

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

Сёння ў тэатрах і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр імені Янкі Купалы
«ПОЗНЯЕ КАХАННЕ»
Пачатак у 19 гадзін.

Адкрыт дзіцячы кінотэатр
У ПАМЯШКАННІ КІНОТЭАТРА «РАДЗІМА»
ДЭМАНСТРЫРУЕЦЦА ФІЛЬМ
„ЧАЛАВЕК З РУЖЬЯ"
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадзін.
Касы адкрыта з 9 гадзін раніцы.

Кінотэатр «Першы»
КІНОФЕСТЫВАЛЬ «ДА ПЫТАННЯ АБ ПЕРАМІРЕ З ФІНЛЯНДЫЯЙ»

Кінотэатр «Беларусь»
«МАЛАХАЎ КУРГАН»

Кінотэатр «Радзіма»
«У ШЭСЦЬ ГАДЗІН ВЕЧАРА ПАСЛЯ ВАЙНЫ»
Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

АТ28137 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—[illegible].